МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

# Маскоўскі РУУС горада Мінска. Катаванні затрыманых 9 – 13 жніўня 2020 года

Грамадскае расследаванне



***«Такога я не чуў крыку, нават калі глядзеў нейкія фільмы жахаў, такога не чуў. Чым гучней ён крычаў, тым мацней яго білі»***

© Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі, 2024

# ЗМЕСТ


Рэзюмэ і метадалогія ....4

Храналогія катаванняў затрыманых 9 – 13 жніўня 2020 года ....8

9 жніўня 2020 года ....10

10 жніўня 2020 года....10
00:00 – 04:00 ....11
04:00 – 08:00 ....11
16:00 – 20:00 ....12
20:00 – 24:00 ....15

11 жніўня 2020 года....19
00:00 – 04:00 ....20
04:00 – 08:00 ....22
08:00 – 16:00 ....24
16:00 – 20:00 ....26
20:00 – 24:00 ....28

12 жніўня 2020 года....31
00:00 – 04:00 ....32
04:00 – 08:00 ....36
08:00 – 12:00 ....40
12:00 – 16:00 ....41
16:00 – 20:00 ....41
20:00 – 24:00 ....42

13 жніўня 2020 года....43
00:00 – 04:00 ....43
04:00 – 08:00 ....45

Наступствы: траўмы і пашкоджанні ў затрыманых ....46

Асобы, адказныя за катаванні затрыманых у Маскоўскім РУУС г. Мінска ....51

Апазнаныя пацярпелымі супрацоўнікі Маскоўскага РУУС г. Мінска ....54

Прававая кваліфікацыя дзеянняў супрацоўнікаў сілавых органаў Беларусі....67

# Скароты ў дакуменце

**Аўтазак** — аўтамабіль для перавозкі затрыманых/зняволеных

**ДПС** — дарожна-патрульная служба

**ІЧУ** — ізалятар часовага ўтрымання

**ІСН** — інспекцыя па справах непаўнагадовых

**КаАП** — Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях

**КПЗ** — камера папярэдняга зняволення

**АДС** — аператыўна-дзяжурная служба

**АМАП** — атрад міліцыі асаблівага прызначэння

**ААПП** — аддзел аховы правапарадку і прафілактыкі правапарушэнняў па масавых мерапрыемствах

**ППС** — патрульна-паставая служба міліцыі

**РУУС** — раённая ўправа ўнутраных спраў

**КВІ** — крымінальна-выканаўчая інспекцыя

**КК** — Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь

**ЦІП** — цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў

# РЭЗЮМЭ І МЕТАДАЛОГІЯ

Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі працягвае цыкл дакументальных сведчанняў злачынстваў супраць чалавечнасці, здзейсненых рэжымам у Рэспубліцы Беларусь пасля выбараў прэзідэнта ў жніўні 2020 года.

Выконваючы сваю задачу па выяўленні ўсіх выпадкаў катаванняў і жорсткага абыходжання, Камітэт публікуе грамадскае расследаванне падзеяў, якія адбываліся ў Маскоўскім РУУС г. Мінска з 9 па 13 жніўня.

Раней эксперты Камітэта апублікавалі расследаванні пра тое, хто і як ужываў гвалт да затрыманых у Фрунзенскім[1], Савецкім[2] і Цэнтральным[3] РУУС, куды, разам з іншымі аддзеламі міліцыі і Цэнтрам ізаляцыі правапарушальнікаў (ЦІП)[4], дастаўлялі людзей у дні масавых пратэстаў супраць абвешчаных вынікаў прэзідэнцкіх выбараў.

У Маскоўскі РУУС затрыманых звозілі з усяго горада з 9 па 12 жніўня.

9 жніўня людзей затрымлівалі ў цэнтры Мінска каля абеліска-стэлы на праспекце Пераможцаў, насупраць гасцініцы «Юбілейная», у раёне вуліцаў Мельнікайтэ, Нававіленскай, Даўмана, Караля, у парку Перамогі, каля Палаца моладзі, універсама «Рыга». 10 жніўня затрыманых прывозілі

1 Грамадскае расследаванне: Катаванні затрыманых у жніўні 2020-га ў Фрунзенскім РУУС г. Мінска. https://torturesbelarus2020.org/belarus-zlachynstva-supracz-lyudskasczi/ (BY)

2 Грамадскае расследаванне катаванняў у Савецкім РУУС 9–13 жніўня 2020 года. «Давай, давай, забівай! Вы што, забыліся, у якой краіне жывяце?» https://torturesbelarus2020.org/davaj-davaj-zabivaj-vy-shto-zabylisya-u-yakoj-kraine-zhyvyacze/ (BY)

3 «Вы здохнеце тут». Вязні Акрэсціна сведчаць. Грамадскае расследаванне. https://torturesbelarus2020.org/vy-sdohnete-zdes/ (BY)

4 Цэнтральны РУУС г. Мінска. Катаванні затрыманых 9–13 жніўня 2020 года. Грамадскае расследаванне https://torturesbelarus2020.org/central_ruvd/ (BY)

таксама з праспекта Дзяржынскага, раёна вуліцы Грушаўскай, станцыі метро «Малінаўка». 11 жніўня — таксама з праспекта Пушкіна (станцыя метро «Пушкінская»), вуліцы Першамайскай, трамвайнага кола на вуліцы Бабруйскай.

Апытаныя пацярпелыя сведчаць, што затрымлівалі іх у горадзе ў вельмі жорсткай форме. У затрыманнях прымалі ўдзел розныя сілавыя структуры. Разам з АМАПам, у гэтыя дні ў горадзе дзейнічалі Спецыяльны падраздзел па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз»[5], байцы падраздзела КДБ «Альфа», а таксама ўнутраныя войскі.

Затрымлівалі ўсіх, хто трапляўся пад руку: выпадковых мінакоў, жыхароў найбліжэйшых дамоў, якія вярталіся пасля працы, з паліклінікі ці крамы, кагосьці выцягнулі з таксі. Некалькіх чалавек затрымалі каля шапіка з шаўрмой. Былі людзі, якія проста выйшлі прайсціся па Мінску, таму што інтэрнет быў заблакаваны і навіны даведацца было немагчыма.

Людзей збівалі дубінкамі як пры затрыманні, так і пры перавозцы ў РУУС. Нярэдка сілавікі ўжывалі электрашокеры і газ з пярцовых балончыкаў.

У Маскоўскім РУУС збіццё і жорсткае абыходжанне з затрыманымі працягваліся. Найбольш жорстка абыходзіліся з людзьмі, пры затрыманні пазначанымі фарбай АМАПам, тыя хто мелі на целе татуіроўкі з нацыянальнымі беларускімі сімваламі, хто размаўляў на беларускай мове і адрозніваўся нестандартнай знешнасцю (з доўгімі або пафарбаванымі валасамі, дрэдамі, пірсінгам). Вялікую агрэсію ў сілавікоў выклікалі айцішнікі, матацыклісты і былыя супрацоўнікі праваахоўных органаў.

У РУУС дастаўленых затрыманых размяшчалі ў актавай зале на трэцім паверсе[6], у калідорах і камерах, якія знаходзіліся ў цокальным паверсе. Менавіта ў гэтых памяшканнях катавалі людзей. Уся падлога ў актавай зале была ў крыві і экскрэментах збітых і параненых. Некаторыя адзначалі, што ў калідорах адбывалася найбольш жорсткае збіццё. Людзі там стаялі на каленях або сагнуўшыся з адведзенымі назад рукамі па 12 гадзінаў.

У розныя дні з 9 па 13 жніўня ў актавай зале адначасова знаходзілася каля 150 чалавек[7]. Усе камеры былі перапоўненыя і ўмовы ўтрымання ў іх былі бесчалавечныя (бруд, вільгаць, задуха, адсутнасць вентыляцыі і магчымасці прылегчы для сну). У кожнай з камераў размяшчалі да 20 чалавек, а ў карцары памерам 1,5х3 метры адначасова знаходзіліся 10 чалавек.

---

5 У адпаведнасці з дадзенымі The Insider https://theins.ru/, байцы падраздзела могуць быць датычныя да забойства Аляксандра Тарайкоўскага падчас задушэння акцый пратэсту ў Мінску 10 жніўня 2020 года, разам з байцамі падраздзела КДБ «Альфа».

6 Пры апісанні актавай залы затрыманыя давалі розную інфармацыю. Некаторыя казалі, што яна знаходзіцца на 4 ці на 5 паверсе. Магчыма, у дадзенай управе ёсць некалькі падобных памяшканняў. Аднак з прычыны неістотнасці мы пакідаем гэтыя дадзеныя ў тым выглядзе, у якім яны былі дадзеныя экспертам.

7 Некаторыя пацярпелыя называлі лічбу да 250 чалавек.

Многія з затрыманых правялі доўгія гадзіны лежачы тварам у падлогу, літаральна адно на адным, або седзячы на крэслах, апусціўшы галаву ўніз з выцягнутымі наперад рукамі. За любы рух ці змену становішча цела людзей збівалі дубінкамі.

Па сведчаннях пацярпелых, яны знаходзіліся ў Маскоўскім РУУС ад некалькіх да 12-16 гадзінаў, некаторыя правялі там да паўтара сутак. За гэты час іх толькі пару разоў вадзілі ў прыбіральню, не кармілі, ваду давалі піць з пластыкавай бутэлькі, якую яны перадавалі адно аднаму. У сувязі з распаўсюджваннем пандэміі COVID-19 невыкананне санітарна-гігіенічных мераў стварала сур'ёзную пагрозу жыццю і здароўю затрыманых. Уначы людзям не давалі спаць, збіваючы тых, хто заснуў, дубінкай.

У гэтыя дні ў РУУС дастаўлялі таксама непаўнагадовых (15–17 гадоў) і пажылых людзей (60 гадоў і старэйшыя). Іх збівалі, нягледзячы на ўзрост і стан здароўя. Сярод затрыманых былі журналісты, адзін з іх — грамадзянін Расійскай Федэрацыі[8].

Жанчын у Маскоўскі РУУС прывозілі разам з мужчынамі, але, як адзначаюць апытаныя, іх не збівалі. Аднак нецэнзурная лаянка, абразы і пагрозы ў дачыненні да жанчын, а таксама збіццё мужчын, сведкамі якіх яны з'яўляліся, выклікалі ў іх страх і боязь гвалту, у тым ліку сексуальнага.

Нястрымныя, непадкантрольныя і заахвочаныя кіраўніцтвам РУУС акты знявагі і здзекі з затрыманых падчас допытаў перараслі ў катаванні, якія ўключаюць сексуальны гвалт. Як мінімум тры пацярпелыя сутыкнуліся з сексуальным гвалтам у дачыненні да сябе ў Маскоўскім РУУС. Гэта вынікае з інтэрв'ю з пацярпелымі, якія вывучылі эксперты Камітэта. Так, ад аднаго з затрыманых было прызнанне факта згвалтавання яго ў Маскоўскім РУУС 12 жніўня 2020 года, яшчэ адзін атрымліваў пагрозы сексуальнага гвалту, а таксама было апісанне такога гвалту ў дачыненні да трэцяга затрыманага.

Агулам для мэтаў дадзенага расследавання эксперты Камітэта старанна вывучылі 48 індывідуальных інтэрв'ю (569 старонак тэксту) з людзьмі, якія былі затрыманыя сілавікамі ў Мінску і дастаўленыя ў Маскоўскі РУУС. На падставе вывучаных інтэрв'ю складзеныя храналагічныя апісанні кожнага дня знаходжання затрыманых у РУУС. Таксама былі прааналізаваныя дадзеныя пацярпелымі фотаздымкі траўмаў і медыцынскія дакументы (58 старонак).

---

8 «Афиша Daily» апублікавала яго пераказ https://daily.afisha.ru/news/40325-korrespondent-znakcom-nikita-telizhenko-rasskazal-o-zaderzhanii-i-izbieniyah-v-belorusskih-tyurmah/

Дадзеная публікацыя ўключае ў сябе:

раздзел Наступствы: траўмы і пашкоджанні ў затрыманых, у якім аналізуюцца фізічныя і псіхалагічныя наступствы знаходжання ў Маскоўскім РУУС г. Мінска;

раздзел Асобы, адказныя за Катаванні затрыманых у Маскоўскім РУУС горада Мінска, які ўтрымлівае апазнанні пацярпелымі супрацоўнікаў Маскоўскага РУУС, аналіз інфармацыі з базаў дадзеных партнёрскіх арганізацыяў і ініцыятываў (Праваабарончы цэнтр «Вясна», «КіберПартызаны») і з адкрытых крыніцаў, сацыяльных сетак, Telegram-каналаў;

раздзел Прававая кваліфікацыя дзеянняў супрацоўнікаў сілавых органаў Беларусі, у якім аналізуюцца дзеянні сілавікоў Маскоўскага РУУС г. Мінска ў адпаведнасці з нормамі нацыянальнага заканадаўства і стандартамі міжнароднага права.

Неабходныя персанальныя дадзеныя і іншыя дакументы ёсць у Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі, аднак у мэтах гарантавання бяспекі крыніцаў і пацярпелых гэтыя персанальныя дадзеныя ў расследаванні не разгалошваюцца.




УУС Адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска на вуліцы Грушаўскай, 9

# ХРАНАЛОГІЯ КАТАВАННЯЎ ЗАТРЫМАНЫХ 9 – 13 ЖНІЎНЯ 2020 ГОДА

***«Я яшчэ ў аўтазаку зразумеў, што, напэўна, можна і не выбрацца адтуль жывым. А ў РУУС я ўжо ў гэтым быў упэўнены».***

***Паводле сведчанняў пацярпелага***

Маскоўскі РУУС г. Мінска ў перыяд з 9 па 13 жніўня 2020 г. стаў адным з месцаў утрымання людзей, затрыманых у горадзе пасля абвяшчэння сфальсіфікаваных вынікаў выбараў прэзідэнта.

Пры затрыманнях сілавікі шукалі каардынатараў пратэстаў і пазначалі фарбай тых, хто, як ім здавалася, мог уяўляць "цікавасць" для далейшых допытаў і пакаранняў.

*«... Ім усім паставілі гэтыя пазнакі, і ім пагрозы былі такія, асабліва жорсткія. Даслоўна яны казалі: "Калі мы прывязем вас на Акрэсціна, вас там дубінкай у жопу ябаць будуць". Вось так гэтым хлопцам было сказана. "За тое, што вы тыпу вось такія". То бок было асаблівае такое ў іх стаўленне да хлопцаў з жоўтымі пазнакамі».*

У Маскоўскім РУУС у гэтыя дні сумесна са штатнымі супрацоўнікамі дзейнічалі сілавікі АМАПа, менавіта яны найбольш жорстка збівалі і ката-

валі затрыманых. Аднак супрацоўнікі РУУС, акрамя афармлення, допытаў затрыманых і падобных працэдураў, таксама не грэбавалі збіваць беззбаронных людзей, якія ляжалі на падлозе. Найбольш бязлітасна збівалі пазначаных пры затрыманні фарбай, а таксама тых, хто, на іх думку, мог быць арганізатарам пратэстных дзеянняў ці іх актыўным удзельнікам. Гэта былі ўладальнікі татуіровак у выглядзе нацыянальных беларускіх сімвалаў, доўгіх валасоў, дрэдаў, пірсінгу, а таксама апранутыя ў белыя майкі, з белымі бранзалетамі на руках. Айцішнікі, лекары, матацыклісты, журналісты (у тым ліку грамадзянін Расійскай Федэрацыі) і былыя супрацоўнікі праваахоўных органаў выклікалі ў сілавікоў найбольшае раздражненне.

*«Аднаго паднялі зранку і сказалі: "Вось ты хацеў міліцыянтам стаць, вучыўся на міліцыянта. А ў цябе Пагоня на майцы, паглядзіце на яго". Атрымліваецца, у актавай зале яны не білі прыкладам, кулакамі, а на вобшуку ўжо па поўнай адрываліся».*

Відавочна, што сілавікам у гэтыя дні быў аддадзены загад на самыя жорсткія дзеянні ў дачыненні да пратэстоўцаў.

*«...было зразумела, што нейкі быў аддадзены загад, таму што калі было збіццё, было адчуванне, што зверху аддалі загад на пабудову канцлагераў».*

Іх не стрымлівала ў гэтыя дні нічога — ні вышэйстаячае начальства, ні чалавечая мараль. Апытаныя распавядаюць пра факты сексуальнага гвалту і пастаянныя пагрозы такога гвалту ў дачыненні як да жанчын, так і да мужчын на працягу ўсяго часу знаходжання ў РУУС.

*«... працягвае збіваць і пры гэтым часта вельмі акцэнтаваў увагу на плату. "Хто табе заплаціў?". Пачаў здымаць штаны, кажа: "Я цябе зараз ябаць буду, прынясіце прэзерватывы". Пачынае біць якраз па пятай кропцы і там ужо пачынае вадзіць менавіта дубінкай вакол пятай кропкі».*

*«Я казаў, што ніхто мне не плаціць, ні з кім не камунікую. Ён казаў... быў момант, што так, што яны хацелі мне дубінку ў задняе месца».*

Псіхалагічная атмасфера ў РУУС была вельмі цяжкая, збітыя і параненыя пры затрыманнях людзі былі прыгнечаныя, прыніжаныя, ахопленыя страхам і бяссіллем. Як адзначалі многія з іх, было адчуванне, што яны знаходзяцца ў палоне ў тэрарыстаў.

Затрыманыя ўтрымліваліся ва ўсіх памяшканнях, дзе толькі можна было іх размясціць: у актавай зале, калідорах, камерах і карцары. У розныя дні, з 9 па 13 жніўня, у актавай зале знаходзілася да 250 чалавек адначасова.

Па аповедах апытаных, яны знаходзіліся ў РУУС ад некалькіх да 12–16 гадзінаў, некаторыя правялі там да паўтара сутак. Сярод затрыманых былі таксама жанчыны, непаўнагадовыя і пажылыя людзі. 15–17-гадовых падлеткаў пасля апытанняў і афармлення перадавалі бацькам.

## 9 жніўня 2020 года

У Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі і арганізацый-партнёраў няма інфармацыі пра затрыманых, якіх даставілі ў Маскоўскі РУУС г. Мінска ўвечары 9 жніўня 2020 г.

Калі вы маеце якую-небудзь інфармацыю ці знаходзіліся ў гэтым РУУС 9 жніўня 2020 г., просім звязацца з намі і расказаць пра дзеянні сілавікоў.

## 10 жніўня 2020 года

> ***«Аднаму сказалі: “Ты што, баксёр?”. У яго капу баксёрскую знайшлі, пачалі збіваць, доўга. Потым той чалавек у камеры сядзеў, у яго ўвесь твар сіні быў, нават па твары білі. Вось ён вельмі апухлы быў. Білі яшчэ аднаго чалавека, пыталіся, хто яго каардынатар. На аднаго крычалі “Анархіст!” і білі яго».***
>
> ***Паводле сведчанняў пацярпелага***

Дастаўленых уначы з горада людзей пры выгрузцы з аўтазакаў праганялі праз “калідоры смерці”, якія складаліся з азвярэлых сілавікоў з дубінкамі, якімі іх неміласэрна збівалі.

Пасля гэтага затрыманых размяшчалі ў актавай зале РУУС, дзе амапаўцы працягвалі іх збіваць усю ноч і раніцу 10 жніўня. Людзей трымалі без руху ў ненатуральных позах на працягу шматлікіх гадзінаў: прымушалі сядзець, схіліўшы галаву і выцягнуўшы рукі наперад на пярэднія сядзенні.

Вечар 10 жніўня для многіх стаў выпрабаваннем. Людзей кідалі на падлогу ўніз тварам, яны ляжалі адно на адным у лужынах крыві. Усе ўнутраныя памяшканні РУУС, у тым ліку актавая зала, калідоры, камеры, службовыя кабінеты і падвал, былі запоўненыя людзьмі. Любыя ўзаемадзеянні з

сілавікамі, ці гэта допыт, ці выхад у прыбіральню, суправаджаліся нецэнзурнай лаянкай, пагрозамі і збіццём. Пры допытах сілавікі пагражалі ім згвалтаваннем.

## 00:00 • 04:00

Затрыманых пачалі даставляць у РУУС і рассаджваць у крэслы ў актавай зале, якая размяшчалася на чацвёртым паверсе будынка. Супрацоўнікі РУУС не прадстаўляліся, на іх не было апазнавальных знакаў і бэйджаў з персанальнымі дадзенымі. Аднак затрыманыя адзначалі, што да прыходу АМАПа яны не ўжывалі да іх гвалт.

Усё змянілася з прыходам амапаўцаў. Уварваўшыся ў актавую залу, яны пачалі выкрыкваць абразы і прымушаць людзей прымаць ненатуральныя позы, у якіх тыя былі вымушаныя знаходзіцца без руху. У прыватнасці, загадвалі моцна нахіліць галаву і пакласці рукі на спінку крэсла перад сабой. За спробы расправіць плечы ці прыпадняць галаву сілавікі абражалі ці збівалі людзей. Тых, хто па нейкіх прычынах не спадабаўся сілавікам, выводзілі ў калідор, дзе прымушалі стаяць, сагнуўшы спіну і упёршыся рукамі ў сцяну, працяглы час.

> *«На кагосьці крычалі, кагосьці білі... Поўная жэсць пачалася. Амапаўцы паводзілі сябе вельмі па-хамску, лаяліся матам, прыніжалі, абражалі. Хлопцаў назвалі підарамі, ублюдкамі, то бок пастаянная лаянка».*

> *«І там людзі вось гэтыя дванаццаць гадзінаў прастаялі практычна ў позе ракам, то бок з сагнутымі спінамі яны стаялі ўсе дванаццаць гадзінаў».*

## 04:00 • 08:00

Частку затрыманых сілавікі пачалі выводзіць у асобныя кабінеты на допыты, падчас якіх, пагражаючы катаваннямі, патрабавалі разблакаваць тэлефоны для вывучэння іх змесціва. Людзей, якія адмаўляліся назваць пароль ад тэлефона, вельмі жорстка збівалі да таго часу, пакуль цалкам змардаваны чалавек не згаджаўся разблакаваць прыладу. Відавочцы сцвярджаюць, што сілавікі выкарыстоўвалі збіццё і для запалохвання астатніх затрыманых, якія выразна чулі крыкі тых, каго збівалі.

> *«На працягу, напэўна, хвілінаў 30–40 крычаў мужчына, прычым ён проста не змаўкаў. Крыкі былі дастаткова гучныя. Супрацоўнікі міліцыі сказалі, што чувак не дае ім разблакаваць тэ-*

*лефон. Вось ужо 40 хвілінаў трывае, а яны намагаюцца выбіць з яго гэты пароль. Жудасная атмасфера...».*

*«Я спрабаваў высветліць, ці законна гэта. Мне намякнулі, што са мной могуць зрабіць усё што заўгодна».*

Сілавікі не толькі не дазвалялі надаваць затрыманым медыцынскую дапамогу, але і адбіралі ў людзей уласныя лекі, якія ім неабходна было прыняць.

*«На допыце я расказала, што мне патрэбныя гэтыя таблеткі, яны кажуць: "Не пытанне, вазьміце ў торбе". Яны ў мяне былі, але калі я спрабавала выпіць гэтую таблетку, адзін чувак, ён быў у форме вайскоўца такой зялёнай, выхапіў іх у мяне».*

Паводле паведамленняў відавочцаў а 2–3 гадзіне ночы ў РУУС знаходзілася каля 240–250 затрыманых. Большасць правяла там усю ноч да моманту пераводу ў іншыя месцы ўтрымання.

## 16:00 • 20:00

У РУУС пачалі прыбываць новыя групы затрыманых. Выгрузка з аўтазакаў суправаджалася жорсткім збіццём. Большасць з тых, хто прыбыў, заводзілі ў будынак РУУС у так званай позе ластаўкі (рукі вывернутыя за спіну высока ўверх, галава нізка апушчаная).

*«Пачалі выгружаць. Выгружалі яшчэ больш страшна, чым загружалі, з неймаверным прыніжэннем, збіццём, твар у падлогу, рукі за спіну, ужыванне спецпрыёмаў. Узялі мяне два чалавекі і пачалі падымаць па лесвіцы. Я адразу сказаў, што я расіянін. На прыступках былі кроплі крыві. Потым вялі па калідоры, пры гэтым астатніх вельмі моцна білі, там былі нечалавечыя крыкі па калідоры. Калі ідзеш па калідоры, ён увесь так трасецца».*

*«З аўтобуса мы выйшлі і там трэба было дайсці да РУУС нейкі час. І вось яны мяне білі. Б'юць, і потым ён мне неяк ударыў каля лёгкага недзе ў грудзі, у мяне кашаль пачаўся, міжвольна натуральна. Ён мне сказаў, каб я трываў».*

*«Хлопец, які перад мной ішоў... Яго білі да гэтага, або яму было цяжка па нейкіх прычынах, калі ён падымаўся на апошняй лесвіцы, ён спатыкнуўся і ўпаў. Яго вельмі моцна пачалі біць, кулаком па нырках, са спіны з крыкамі "ўставай", а ён задыхаўся».*

Некаторым затрыманым падчас канваявання наўмысна наносілі траўмы.

> *«Пакуль яшчэ вялі ў актавую залу, пару разоў білі, а адзін раз было такое, ад чаго нос мацней за ўсё пацярпеў і два сколы на зубах з'явіліся: яны спецыяльна як таранам міма дзвярэй прапусцілі і ў сценку».*

> *«Праваахоўнікі пачалі выводзіць іх, загнуўшы рукі за спіну. Хлопца перада мной спецыяльна галавой аб дзвярны вушак уваходу ў РУУС ударылі. Ён закрычаў ад болю. У адказ на гэта яго пачалі біць па галаве і гарлапаніць: "Заткніся, сука!". Першы раз мяне ўдарылі менавіта калі выводзілі з аўтазака. Я проста недастаткова нізка нагнуўся і атрымаў удар рукой па галаве, а потым каленам у твар».*

Людзей таксама размяшчалі ў актавай зале, пры гэтым стаўленне да асобаў мужчынскага і жаночага полу адрознівалася. Жанчын пераважна рассаджвалі на сядзенні, размешчаныя па перыметры залы і прымушалі сядзець ва ўжо згаданых вышэй ненатуральных позах (максімальна сагнуўшыся наперад і выцягнуўшы рукі на пярэднія сядзенні). У той жа час мужчын жорстка кідалі тварам на падлогу ў прастору паміж крэсламі і прымушалі ляжаць, трымаць рукі за галавой. Відавочцы адзначалі, што жанчыны не траплялі ў гэты час пад такое інтэнсіўнае збіццё, як мужчыны.

> *«Па-першае, ён мяне кінуў на падлогу, а па-другое, калі ён кінуў, ён наступіў нагой на галаву. У мяне з-за гэтага было рассячэнне на падбародку. Мы ляжалі на жываце, рукі за спінай, і з-за таго, што ён на мяне наступіў, там на падлозе была такая плітачка і я аб яе стукнуўся, у мяне кроў цякла гадзіны дзве-тры».*

Людзей, якіх пасадзілі на крэслы, прымушалі некалькі гадзінаў знаходзіцца з сагнутай спінай, апушчанай уніз галавой і выцягнутымі на пярэднія крэслы рукамі. Тых, хто спрабаваў размяцца або падняць галаву, збівалі дубінкамі па галаве, спіне і руках.

> *«Усе сядзелі ў актавай зале з апушчанымі галовамі. Мы так сядзелі ў актавай зале агулам гадзіны тры, напэўна. Ужо ўсё зацякала. Увесь час нейкая мітусня, крыкі, і ў тым ліку збіццё. Пастаянна білі — хтосьці галаву падняў выпадкова, яму адразу па галаве б'юць. Проста новых, якіх прыводзілі, таксама білі, гэта было цудоўна чуваць».*

*«Сказалі рукі пакласці на пярэдняе крэсла. Там прыкладна як у самалёце адлегласць была. І там білі таксама дубінкамі, думаў, як бы калі мне стукнуць, то мне зламаюць пальцы. Іншым не давалі мяняць позу, а я мог рукі перакладваць. Іншых проста лупілі, я чуў гэтыя ўдары ўвесь час і мат. Тыя, хто патрабаваў нейкія правы, тых яшчэ мацней лупілі».*

З-за збіцця ў аўтазаках многія людзі дастаўляліся ў РУУС з прыкметамі траўмаў ці прыступамі хранічных захворванняў. Пры гэтым сілавікі не толькі не прадпрымалі мераў па наданні медыцынскай дапамогі, але і працягвалі катаваць людзей, толькі пагаршаючы іх стан.

*«Быў чалавек, які задыхаўся ад таго, што яго вельмі моцна ўдарылі некуды ў грудзі ці ў жывот. Ён крычаў свой дыягназ, каб яму выклікалі лекара. Усё, што зрабіў АМАП, гэта ўзяў пяцілітровую бутэльку вады, ударыў яго і выліў яму [ваду] на галаву».*

*«Ён сказаў, што ён анкахворы, гэта значыць яму належныя ўмовы спецыяльныя, як ракаваму хвораму. Яго прапановы былі праігнараваныя. Больш за тое, калі яго прывезлі ў РУУС, ён не мог падымацца па паверсе, пачаў прытомнасць губляць. Увогуле, у яго ногі заплятаціся. Яны яго пачалі біць, у яго яшчэ больш заплятацца сталі, яны яго яшчэ больш б'юць».*

*«Аднаму хлопцу пашкодзілі спіну, ці ў яго ўжо была грыжа нейкая, калі яго затрымалі, ударылі моцна. Ён скардзіўся, прасіў сесці, таму што яму складана было ў такім становішчы знаходзіцца доўгі час, але яму ніхто не дазволіў, натуральна».*

*«Нягледзячы на тое, што мінчане ляжалі, іх пастаянна збівалі. Мне падалося, што ў некаторых затрыманых былі зламаныя ў каго рукі, у каго ногі, у каго пазваночнік, таму што пры найменшым руху яны галасілі ад болю»*[1].

Некаторых затрыманых дастаўлялі ў вельмі туга зацягнутых кайданках, якія сілавікі адмаўляліся здымаць. Рукі ў людзей ад недастатковага кровазабеспячэння сінелі і дранцвелі.

*«Далей я некалькі разоў сказаў: "Паслабце, калі ласка, кайданкі. Я рук не адчуваю". Не звярнулі ўвагу. Адзін супрацоўнік кажа іншаму: "О, у яго бранзалеты, схадзі па ключы. У яго яны сінець пачынаюць". Вярнуўся гэты чалавек, якога ён дасылаў, спра-*

1 https://www.gazeta.ru/social/2020/08/14/13194151.shtml

*бує, не атрымліваецца нічога. Ён кажа: "Гэта старога ўзору, будзеш так сядзець, не пашанцавала табе". Ну я адпаведна праз 5–10 хвілінаў яшчэ раз пытаюся, і ён такі: "Блін, схадзі пашукай, рэальна сінія". Той ужо вярнуўся з правільнымі ключамі, таму што атрымалася адшпіліць, але ўсё адно вельмі балюча было рукам».*

## 20:00 • 24:00

На тэрыторыю РУУС пачало прыбываць усё больш людзей, пры гэтым градус гвалту з боку сілавікоў усё падвышаўся. Пасля выгрузкі з аўтазака людзей па-ранейшаму праганялі праз "калідор смерці" — сілавікі хаатычна дубінкамі, нагамі і рукамі наносілі ўдары затрыманым.

*«Прывезлі ў двор РУУС, адчынілі дзверы, сказалі: "Хутка ўсе выбягаем, рукі за спіну, мордай у падлогу, у сагнутым стане". Выбягалі ўсе з аўтазака, стаяла некалькі амапаўцаў, лупілі дубінкамі, як бы паскаралі працэс».*

*«Гэтыя калідоры такія, то бок цябе выводзяць з аўтазака, стаяць ужо людзі, і ты ідзеш і цябе так суправаджаюць ударамі ўвесь час. Падымаючыся на паверх нейкі, цябе твой АМАПавец вядзе, іншы АМАПавец ідзе табе насустрач, і міма проста так не праходзіць цябе, ён так з локця, дубінкай стукне».*

Збіццё працягнулася і пры перамяшчэнні ўнутры будынка РУУС. Асабліва жорстка збівалі на лесвіцы і ў калідорах паміж уваходам у будынак і актавай залай.

*«Калі трэба было падняцца на пяты паверх, там падключылася яшчэ некалькі людзей. І яны мяне ўсе пяць паверхаў мутузілі, пераважна білі недзе па нагах, ну па спіне таксама і па ягадзіцах».*

*«Калі ў актавай зале яшчэ параўнальна не вельмі моцна білі людзей, то ў калідорах было больш жорстка. Чуваць было, як іх б'юць. Мы, тыя хто ляжалі ў актавай зале, абураліся і спрабавалі крычаць: "Што ж вы робіце, спыніцеся!". Здавалася, там ужо нічога жывога няма».*

Сілавікі прымушалі выконваць свае загады максімальна хутка, пры любых прамаруджаннях збівалі людзей.

*«Калі нас выводзілі і падымалі на чацвёрты паверх, яны кшталту мянялі тэмп, таму паспяваць за імі было складана. І я не-*

*калькі разоў спатыкаўся. Яны мяне вось у гэтыя вось моманты дубінкамі ззаду білі, ну то бок падганялі».*

*«Калі мяне падвезлі, мяне першага выцягнулі з аўтазака, пабілі. Чатыры чалавекі з усіх бакоў накінуліся, кулакамі, берцамі білі. Пацягнулі мяне некуды. Я там нагамі як мог перабіраў, але яны ўвесь час прыспешвалі, тыпу "хутчэй, хутчэй". А паколькі рукі заломвалі назад, то бегчы нязручна. Потым я проста перастаў нагамі перабіраць і мяне проста цягнулі. Праз галаву перакруцілі, пазбівалі яшчэ раз, паклалі тварам у плітку».*

Апоўначы ў актавай зале РУУС знаходзілася мінімум 150 затрыманых, з якіх каля 15-20 — жанчыны. З-за недахопу месца сілавікі пачалі класці людзей адно на аднаго другім пластом. Тых, хто прыбываў новы, прымушалі ісці па людзях, якія ляжалі на падлозе, а потым паўзці ў бок вольнай прасторы.

*«Мы заходзім у гэтую актавую залу — і там людзі ляжаць на падлозе. Проста штабелямі ляжаць з рукамі за галавой, і той сілавік, які мяне вядзе, ён кажа «ідзі». Ён хацеў, каб я проста ішоў па гэтых людзях. Я спрабаваў іх неяк пераступіць, недзе на кагосьці выпадкова наступаў. Спрабаваў не наступаць, але гэта было складана, таму што там іх вельмі шмат, усе ляжаць».*

*«... штурхалі ў твар [людзей], якія, відаць, хутка не рэагавалі, што трэба рабіць. Ну ці так проста. А білі там, лупілі. Там вялізная колькасць удараў сыпалася на людзей... Прымушалі паўзці, людзі адно на аднаго кладліся. Яны самі стваралі гэтую мітусню спецыяльна, не давалі табе расслабіцца, нагняталі».*

*«Тыя, хто ляжаў на падлозе, ім казалі: "Галаву ў падлогу". Калі нехта не слухаўся, у кагосьці зацякала шыя, ён не мог нешта зрабіць, яны дамагаліся гэтага сілай. Збівалі нагамі».*

Толькі праз некаторы час, калі затрыманых стала занадта шмат, сілавікі дазволілі ўсім, хто ляжаў, перамясціцца на крэслы. Таксама каля 15–20 чалавек размясцілі ў падвале будынка, дзе іх прымусілі стаяць на каленях, галавой у падлогу з рукамі за спінай, са скрыжаванымі нагамі. Людзі, якія спрабавалі ў адказ неяк рэагаваць на дзеянні сілавікоў або патрабаваць захавання законнасці, былі асабліва жорстка збітыя.

*«Мужчын, якія працягвалі адстойваць сваю пазіцыю, клалі на падлогу і збівалі нагамі».*

*«Там нейкі чалавек адмовіўся называцца, назваць сябе, сказаць ПІБ. На яго крычыць амапавец: “Называй, кажы, інакш дрэнна будзе”. Ну вось ён яго б'е, вельмі чуваць добра па гуках, што дубінкай. Ён усё адно маўчыць, і вось калі амапавец ужо выйшаў з сябе, ён кажа: “У цябе што, лішнія органы ёсць?” і звёў яго».*

З-за бесперапыннага збіцця падлога ў актавай зале і калідорах была залітая крывёй, якую сілавікі прымушалі затрыманых выціраць сваім адзеннем.

*«І пакуль мы ішлі па калідорах, я бачыла, што ўся падлога была залітая літаральна крывёй. Яна была размазаная, усё было ў крыві».*

*«Калі яго выводзілі, ці то ў яго пайшла кроў носам пасля ўдару, ці ён ёй накапаў на падлогу. Супрацоўнікі АМАПа прымусілі яго сваім адзеннем выціраць гэтую кроў».*

*«Быў яшчэ чалавек, якога збівалі, у яго пайшла кроў. І міліцыя пачала крычаць: “ Што гэта такое? Што гэта тут за свінарнік развёў? Зняў майку і выцер хутка!”».*

Сілавікі пачалі па адным адводзіць людзей у асобныя кабінеты, праводзіць вопіс рэчаў і асабістыя дагляды. Увесь гэты час яны працягвалі здзекавацца з затрыманых і збіваць іх.

*«На даглядзе паставілі рукамі да сцяны, ударылі па назе, каб шырэй, і абшукалі цалкам. У мяне было перабінтаванае калена. Ён мне за гэта ўдарыў у вобласць нагі проста над костачкай. Ён увесь бінт гэты дастаў, выкінуў, крычаў: “Глядзіце, у яго бінты, ён нас душыць збіраецца!”. І ўдарыў мяне за гэта па назе».*

Асаблівую агрэсію ў сілавікоў выклікалі людзі з нестандартнай знешнасцю, напрыклад, мужчыны з татуіроўкамі або доўгімі валасамі.

*«Калі амапавец пагражаў мне, што адрэжа коску, ён цягнуў мяне за валасы, потым я яму сказаў: “Ну адрэжаш, адразай, ладна”. Потым зноў пачаўся крык, лаянка. Яны пачалі біць. Яны спрабавалі далей заламаць рукі, каб я быў тварам у падлогу. Яны стараліся іх заламаць, пры гэтым наносілі ўдары, лаяліся. Білі рукамі па спіне, плячах, білі ў жывот, нават у твар спрабавалі».*

Некаторых людзей збівалі настолькі жорстка, што з-за моцнага болю яны міжвольна спаражняліся.

*«Калі я там ляжаў, некаторыя крычалі: “Вось, ён абгадзіўся, у штаны наклаў!”. То бок, людзей прымалі так жорстка, што некаторыя ці былі моцна збітыя ці вось ад страху».*

*«Яшчэ аднаго хлопца, крыху далей, яго пазней прывялі, настолькі моцна збілі, што ён абгадзіўся».*

Сілавікі праводзілі допыты, падчас якіх па некалькі разоў прымушалі людзей называць свае персанальныя дадзеныя і адказваць на адны і тыя ж пытанні, а таксама разблакаваць тэлефоны. Складалі сфальсіфікаваныя пратаколы затрыманняў і прымушалі іх падпісваць.

Частку затрыманых дапытвалі проста ў актавай зале ці калідоры. Некаторых адводзілі ў асобныя памяшканні, дзе за зачыненымі дзвярыма пагражалі згвалтаваць дубінкай і ажыццяўлялі з імі гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару.

*«Працягвае збіваць і пры гэтым часта вельмі акцэнтаваў увагу на тое, хто мне заплаціў. Пачаў здымаць штаны, кажа: “Я цябе зараз ябаць буду, прынясіце прэзерватывы”. Пачынае біць якраз па пятай кропцы і там ужо пачынае вадзіць менавіта дубінкай вакол пятай кропкі. Ён проста ў твар глядзіць, пытаецца: “Ты разумееш, што мы цябе зараз выябем?” Распісвае ў дэталях як і што са мной зробіць, калі я не скажу, хто мне заплаціў».*

Пасля працэдуры вопісу і допыту затрыманых адводзілі на цокальны паверх, дзе здымалі на відэа: патрабавалася назваць прозвішча, імя, імя па бацьку, дату нараджэння, месца затрымання, месца працы, месца вучобы і асаблівыя прыкметы (шнары або татуіроўкі на целе). Частку затрыманых перамяшчалі ў цесныя камеры (каля 3-х метраў у шырыню і 10-ці ў даўжыню), якія не былі прызначаныя для такой колькасці людзей. У камерах было вельмі душна, не працавала вентыляцыя. Перамяшчэнні ў камеры таксама суправаджаліся збіццём.

*«Ён давёў мяне нармальна, але там вось, дзе ўжо гэтыя камеры, стаяў нейкі люты амапавец, які мяне адразу кінуў галавой у сцяну. У мяне на лбе быў удар».*

Людзей вадзілі ў прыбіральню неахвотна, таксама збіваючы і зневажаючы па дарозе, а некаторых і зусім не вадзілі за ўвесь час утрымання ў РУУС.

*«Уначы некаторыя праваахоўнікі дазвалялі хадзіць у прыбіральню — іншыя камандавалі рабіць гэта “пад сябе”».*

*«…ён сказаў ісці, там да прыбіральні пару метраў, ён мяне крыху адпусціў і тыпу з нагі мне так засандаліў, што я ўляцеў у дзвярны вушак».*

*«Мяне адпусцілі ў прыбіральню праз 10 гадзінаў прыблізна. Гэта літаральна за дзве гадзіны, як мяне выпусцілі».*

## 11 жніўня 2020 года

***«Што мяне больш за ўсё ўразіла — тое, што адзін з іх крычаў, што “мы толькі чакаем, калі нам дазволяць ужываць зброю, і мы вас, сук, будзем расстрэльваць. Усіх будзем страляць!”».***

***Паводле сведчанняў пацярпелага***

***«Паўзлі па розным брудзе. Па крыві, па слінах, можа, нават мачы, бо нават яны самі так казалі: «О, ужо гаўняцом тут папахвае, хтосьці тут ужо абгадзіўся».***

***Паводле сведчанняў пацярпелага***

Паводле сведчанняў затрыманых, пасля поўначы, з надыходам 11 жніўня, гвалту і жорсткасці ў Маскоўскім РУУС стала яшчэ больш. У гэтую ноч туды прывозілі затрыманых удзельнікаў пратэстаў з раёнаў Каменнай горкі і ўніверсама “Рыга”.

Пратэстоўцаў дастаўлялі ўсю ноч, сярод сілавікоў хадзілі размовы, што ў РУУС знаходзіцца каля 300 чалавек. Увесь будынак быў запоўнены затрыманымі, асноўная маса якіх размяшчалася ў актавай зале (каля 150 чалавек) — ляжалі на падлозе тварам уніз, сядзелі на крэслах. Затрыманым часам давалі ваду, але ўсім не хапала: было дзве бутэлькі, якія перыядычна напаўнялі і давалі з іх піць. Частка раней затрыманых была перамешчаная ў камеры РУУС. Імі таксама былі запоўненыя калідоры і іншыя памяшканні. Людзей збівалі.

*«Перыядычна прывозілі людзей, кожныя недзе трыццаць хвілінаў да трох гадзінаў ночы, разоў пяць ці шэсць… І гэты роў быў пастаянны. Гэта значыць, яны там не размаўлялі, яны толькі раўлі, гарлапанілі, як вар'яты, на людзей. Усе праз гэта ўжо праходзілі людзі, іх кідалі на падлогу, збівалі на падлозе, прымушалі поўзаць па гэтай падлозе. Гэта было невыносна трываць».*

## 00:00 • 04:00

Мацней за ўсё збівалі тых, каго затрымалі ў горадзе ўначы і прывезлі ў РУУС каля дзвюх гадзінаў. Асноўнае збіццё адбывалася ў памяшканні праз сцяну ад актавай залы. Затрыманыя чулі гукі ўдараў, крыкі, стогны. Адмысловая ўвага надавалася непграмадзянам Беларусі і прыезджым з іншых гарадоў Беларусі. Іх выводзілі з актавай залі, дзе сядзелі астатнія затрыманыя, і збівалі. Катаванні за сцяной актавай залы праводзіліся ў асноўным сілавікамі АМАПа, якія даставілі да гэтага часу новую партыю. Калідоры былі ў крыві.

Супрацоўнікі РУУС ігнаравалі катаванні і здзекі, якія адбываліся на іх тэрыторыі. Дляператрусаў людзей выводзілі з актавай залі ў калідор. У калідорах людзі сядзелі на каленях, ілбом у сцяну, рукі ззаду, ногі скрыжаваныя. На цокальным паверсе людзі размяшчаліся ў цесных і душных камерах, там таксама ўжываліся катаванні супрацоўнікамі РУУС.

> *«За сцяной актавай залы, то бок я не ведаю, якая там сцяна, я не ведаю планіроўкі раённай управы ўнутраных спраў, … кагосьці збівалі. Былі гукі ўдараў, былі гукі, стогны, крыкі, прычым былі такія, што сцены трэсліся, то бок не білі чалавека, а білі чалавекам аб падлогу, аб сцены».*

> *«Чуеш удары дубінкай, кулакамі. Нейкая валтузня была. Можа чалавек упіраецца, потым чуеш удары-ўдары, хтосьці крычыць, а хтосьці не, проста трывае, войкае, але не ў істэрыцы».*

> *«Усе супрацоўнікі міліцыі, якія былі там, ведалі, што адбываецца: яны зачынілі дзверы, каб не было так гэта чуваць. Яны самі прыціхлі, нічога не казалі адзін аднаму ў той момант, калі адбывалася ўсё гэтае збіццё».*

Нягледзячы на тое, што людзі мелі патрэбу ў медыцынскай дапамозе, сілавікі ігнаравалі просьбы і патрабаванні выклікаць медыкаў. Медыцынская дапамога нікому не надавалася. Людзі спаражняліся пад сябе ад болю і страху. Некалькі затрыманых мяркуюць, што аднаго чалавека за сцяной актавай залы збілі да смерці.

> *«Збілі настолькі, што потым спыніліся, але ён, бедны, выдаваў нейкія... Аказалася, што ў яго здарыўся нейкі прыступ. І ніхто на яго не звяртаў увагі».*

> *«Такі хрып паўжывёльны і прасілі, каб яму выклікалі хуткую, ну, прасілі тыя, хто сядзеў. На што міліцыянты сказалі, што ўсё без вас ведаем, што рабіць. Потым гэты стогн скончыўся, я не ведаю чаму: памёр ён ці яго завезлі куды-небудзь».*

*«Адзін такі чалавек, ён называў яго Алег, я падазраю, што яго забілі там».*

*«Людзі сікаліся пад сябе, хадзілі па вялікаму — таксама пад сябе, некаторыя ад болю».*

*«Я сказаў, што губляю прытомнасць, супрацоўніку, за што ён мяне ўдарыў, падняў за валасы і падклаў мне красовак пад галаву. Каб я не ляжаў на зямлі, ілбом упёршыся ў падлогу, а каб ляжаў на сваім жа красоўку, ужо без шнуркоў».*

Асаблівую жорсткасць сілавікі выяўлялі да тых, хто нейкім чынам адрозніваўся ад нейкай прыдуманай імі нормы. Падставай для здзекаў станавіліся лішняя вага, цёмны колер скуры, татуіроўкі, пірсінг, доўгія валасы. Таксама жорстка збівалі актывістаў, журналістаў.

*«Да яго [журналіста] было больш жорсткае стаўленне. Яму адбілі ныркі, зламалі рабро. Ён сказаў, што працуе на TUT.by, і за гэта яны яго білі. Яшчэ расказваў, што ён быў затрыманы на Стэле, іх было трое, і аднаму з яго сяброў... Яго ўзялі за валасы і нажом адрэзалі валасы».*

*«Аднаго хлопца... усё чапляліся, чаму ў яго крыж праваслаўны на спіне — тату было, і прымушалі яго чытаць "Ойча наш" услых гучна і білі пры гэтым».*

Да жанчын, якія знаходзяцца ў актавай зале, гвалт не ўжываўся ў адрозненні ад іншых памяшканняў РУУС. У адным з кабінетаў на верхніх паверхах будынка працавала дзяўчына, якая, наадварот, выяўляла да жанчын асаблівую жорсткасць і здзекавалася з іх. Сярод затрыманых таксама быў непаўнагадовы.

*«У дзяўчыны, затрыманай, быў, верагодна, пірсінг, мікрадэрмал ён называецца, на грудзях. Яго даставалі пласкагубцамі».*

*«Дзяўчатам таксама пагражала дзяўчына, якая супрацоўніца, што "Я цябе зараз пастрыгу, прастытутка! Што табе дома не сядзіцца? Ты ведаеш, што з табой будзе ў турме? Я ўсё для гэтага зраблю, я гэтаму паспрыяю, каб табе там добра жылося!"».*

*«Дзяўчынка плакала адна вельмі моцна. Спытаў: "Чаго ты, сука, равеш?" На яе пачаў крычаць адзін. Яна кажа: "Пада мной гэтыя лужыны крыві, я не магу на іх глядзець. Мне дрэнна, мяне ванітуе". Яны яшчэ хвілінаў 15 здзекаваліся з яе і гэтак далей: "Глядзі, глядзі", — і гэтак далей. "Каб ты ведала, што такое кроў"».*

*«Быў хлопец, якому было 16 гадоў. Ён бясконца патрабаваў, каб выклікалі яго бацькоў».*

Некаторых затрыманых дапытвалі, пры гэтым допыты здымалі на відэакамэру. Калі людзей выводзілі на дагляд, ім наносілі ўдары, іх ставілі на калені, выкручвалі рукі. Тых, хто спрабаваў не пагаджацца з пратаколамі, збівалі. Сярод сілавікоў, якія дапытвалі, былі дзве жанчыны, якія, нягледзячы на тое, што адбываецца, фліртавалі са сваімі калегамі.

*«Запомніў тое, што гэта ўсё здымалі на відэакамеру. Хадзіў аператар з ручной відэакамерай, або самі моманты допыту здымалі, дакументавалі».*

*«Пры гэтым адразу іх ставілі на калені. Я чуў каманды, з ударамі вельмі моцнымі. Рукі трэба было падняць і расставіць».*

*«Хтосьці стаў не згаджацца з пратаколам, потым было маўчанне, вельмі шмат збіцця, потым сказалі: "Навошта ты мне ўсё запырскаў?"».*

*«Там сядзелі дзве жанчыны. Яны пры гэтым смяяліся. Потым падчас гэтага ўсяго яны фліртавалі з мужчынамі, я чуў. Гэта ўсё дзіка, стогны, крыкі, збіццё, і на фоне гэтага жыццё [у іх] кіпіць, цячэ».*

## 04:00 • 08:00

Збіццё і здзекі з затрыманых працягваліся. Збівалі так, каб у самой актавай зале ўсё гэта бачылі і чулі. У гэты час увесь час адбываліся нейкія перасоўванні. Людзей то адводзілі ў камеры, то прыводзілі ў актавую залу, потым ізноў адводзілі ў камеры. У РУУС да самай раніцы працягвалі прывозіць затрыманых. Працягваліся допыты і дагляды, на даглядах збівалі.

*«Але такіх гукаў, такіх крыкаў я ў жыцці не чуў. Гэта жах нейкі. Яны яго білі так, што я не ўпэўнены наогул, ці жывы ён, шчыра, гэты хлопец».*

*«Увесь гэты час, што мы працягвалі сядзець у актавай зале, я чуў пастаяннае збіццё і крыкі. Гэта значыць знаходзіцца [там] было немагчыма, стан быў маральна ўжо настолькі прыгнечаным».*

Умовы ўтрымання ў камерах станавіліся ўсё больш жахлівымі: перапоўненасць людзьмі, моцная вільготнасць, мэтанакіравана выключаная вентыляцыя. У адказ на спробы людзей абараніць свае правы іх зноў збівалі.

*«…кіслароду не хапала. Вентыляцыю яны адключалі адмыслова, там была магчымасць яе ўключыць. Адсутнасцю кіслароду мучылі нас».*

*«Было шмат крыві на плітках падчас гэтага перыяду, менавіта недалёка ад камераў».*

*«Плюс няма ніякага свежага паветра, ніякай вентыляцыі. Праз літаральна паўгадзіны ў нас сцены ўжо мокрыя былі, не кажучы ўжо пра нас. Мы былі ўжо настолькі мокрыя, што маю майку можна было проста выціскаць».*

*«Адна жанчына сказала, што "я — грамадзянка Расійскай Федэрацыі, вы не маеце права". Я пачуў, як адчынілі дзверы да яе і як быццам нешта туды вылілі на яе. Потым далей яны [затрыманыя] казалі, што "паліць, паліць, паліць", то бок нешта на іх вылілі такое, не ваду».*

Збіццём займаліся як амапаўцы, якія знаходзіліся ў РУУС, так і сілавікі РУУС. Падчас збіцця мелі месца пагрозы сексуальным гвалтам. Да затрыманых, якія знаходзіліся ў калідоры, ужываліся катаванні вадой, іх тапілі ва ўнітазе і ракавіне ў прыбіральні РУУС.

*«Ён таксама плакаў, прасіў спыніцца і калі амапавец скончыў [біць], ён у яго спытаў: "… з прэзерватывам ці без?"».*

*«Тут жа яго кінулі, узялі мяне. Як пасля аказалася, гэта вадзілі ў прыбіральню і тапілі ва ўнітазе. Пакуль зліўны бачок набіраўся, пераносілі ў ракавіну, тапілі ў ракавіне. Потым бачок набіраўся, назад ва ўнітаз, ізноў злівалі і тапілі».*

*«У адрас Ціханоўскай Святланы таксама казалі, што вашая прастытутка зараз на Кіпры сядзіць з вашымі грашыма, а вы тут павяліся, што пераменаў вы хочаце. Вось вам перамены, мы вам усім зладзім, будзем зараз вас гвалтаваць дубінкамі, усё запісваць на відэа і адпраўляць у турмы, каб вам там не здавалася жыццё мёдам».*

Затрыманых прымушалі сядзець на крэслах, апусціўшы галаву ўніз. Тых, хто падымаў галаву, білі. Некаторых прымушалі заціскаць галаву паміж каленямі, за любы рух збівалі. Хтосьці сядзеў у актавай зале ў такой позе па 6–8 гадзінаў і больш. У прыбіральню вадзілі па просьбе, аднак многія не прасілі пра гэта з-за страху зноў быць збітымі. Зрэдку давалі піць ваду, пры гэтым усяляк абражаючы.

*«Ваду давалі, але вельмі мала і рэдка, і калі вада заканчвалася, супрацоўнік казаў: “Калі вы, ублюдкі, ужо нап'ецеся?”».*

*«…прымусілі заціснуць галаву паміж каленямі, нікому не давалі падымацца. Хто падымаўся, таго таксама білі або па ключыцах, або па галаве».*

Затрыманым нічога не казалі пра тое, што з імі будуць рабіць далей, не давалі патэлефанаваць родным. З боку сілавікоў бясконца гучалі пагрозы, абразы, нецэнзурная лаянка. Затрыманыя адзначалі, што сярод сілавікоў шмат у каго была правінцыйная гаворка, а некаторыя спрабавалі змяняць свой голас.

*«Усё суправаджалася матамі, пастаяннымі абразамі. Нехта з супрацоўнікаў каверкаў свой голас, каб яго, верагодна, не пазналі. То бок не сваім тэмбрам голасу казаў».*

*«Потым падышлі да мяне, сказалі: “Ты што нам п*здзіш, зараз мы цябе адвядзем, ты нам усё раскажаш”».*

У раёне 7 гадзінаў раніцы з РУУС адпусцілі прыкладна 30–50 чалавек, у асноўным непаўнагадовых і некаторых дзяўчат. Папярэдне ім далі падпісаць абавязальніцтва пра яўку ў суд.

Таксама зранку з РУУС як мінімум адзін аўтазак з прыкладна 35 затрыманымі з'ехаў у Жодзіна. Пры пагрузцы ў аўтазак людзей збівалі дубінкамі.

*«Нас зноў загрузілі ў аўтазак. Напэўна, кожны атрымаў па два ўдары дубінкай — такім чынам амапаўцы паскаралі працэс пагрузкі людзей у аўтазак».*

*«Усе былі пабітыя. Адзін чалавек сядзеў непадалёк наогул збіты, абсіканы і абкаканы. Малады хлопец, але жудасна быў збіты».*

*«… сустракалі нас, калі нас прывезлі на аўтазаку ў РУУС, нейкія хлопцы ў звычайным цёмна-сінім адзенні і нават у іх не было масак на твары, лупілі нас дубінкамі для паскарэння працэсу разгрузкі і таксама, калі грузілі ў аўтазак, каб адвезці ў турму».*

## 08:00 • 16:00

***«Я магу сказаць, што гэта былі дзве самыя страшныя гадзіны ў маім жыцці. Яны нас збівалі там, яны здзекаваліся».***

***Паводле сведчанняў пацярпелага***

***«Таксама страшны момант, калі яны сказалі: “ Хоць адзін з вас торгнецца, я ўжываю агнястрэльную зброю на паражэнне. Мне па барабане. І ведаеце, што самае прыемнае ў гэтым? Мне за гэта нічога не будзе!”».***

***Паводле сведчанняў пацярпелага***

Пасля таго, як зранку частка затрыманых была адпушчаная пад падпіску аб яўцы ў суд, працягвалася складанне пратаколаў. Многія пацярпелыя адзначаюць, што супрацоўнікі РУУС вельмі перажывалі за рэчы затрыманых, баяліся, што іх пакараюць, калі нешта згубіцца. Гэта выглядала вельмі дзіўна на фоне таго, што яны абсалютна не перажывалі, што ў РУУСе ўсю ноч каталі людзей і здзекаваліся з іх. Пастаянна адчувалася разгубленасць і адсутнасць парадку ва ўправе: то не далічыліся двух затрыманых, то камусьці аддалі не тыя рэчы. Сілавікі, не саромеючыся, абмяркоўвалі, каму і які артыкул «намаляваць» у пратаколе.

*«Да таго, як раздавалі пратаколы, я яшчэ чуў, што там была ідэя, ну вось мімаходам, так, вухам, чуў, як яны пералічвалі імёны нейкія, і там вырашалі, які артыкул ім даць. Ну вось самі я назвы артыкулаў не чуў, чуў: “Давайце яму гэта, ну вось гэта”. І быў момант, калі “Давай напалову ўсім дамо адзін артыкул, напалову іншы”...».*

*«Супрацоўнікі міліцыі, было бачна, што яны захоўваюць агрэсіўнасць, але яны ў нейкай ступені ў разгубленасці».*

У РУУС знаходзілася шмат людзей з відавочнымі траўмамі, сур'ёзнымі захворваннямі, але ўсе просьбы пра дапамогу ігнараваліся, медыкаў ніхто не выклікаў.

*«Са мной быў моцна збіты малады чалавек. Ён быў дастаткова моцны, у яго была вялікая гематома, практычна вачэй не бачыў, у яго кружылася галава».*

Усіх затрыманых сталі размяркоўваць з актавай залы па камерах, працягваючы збіццё. У адной з камераў людзям было загадана стаяць, і сядзець ім дазволілі толькі праз гадзіну. Вентыляцыю амаль не ўключалі, ваду давалі ў мізэрных колькасцях (2 літры на 35 чалавек на 2 гадзіны), там стаяла невыносная спякота. Каля 10 чалавек змясцілі ў карцар. Туды ваду не перадавалі зусім, у прыбіральню не вадзілі.

*«Гэта такія камеры папярэдняга затрымання, разлічаныя на двух чалавек. Нас туды запіхнулі, па-мойму, каля 30 ці 35 чалавек. То бок, мы стаялі, прастаялі, напэўна, хвілінаў 40».*

*«Там быў трэш. Мы, вядома, надыхалі і тэмпература там была градусаў 40. Натуральна, гэтая бутэлька вады адразу па глытку разышлася на ўсіх за пяць хвілінаў. Проста праз 10 хвілінаў, напэўна, нашага знаходжання, я быў увесь мокры, проста з мяне цякло ручаём».*

*«Каля абеду нас завялі ўніз, у маленькую камеру, білі вельмі жорстка. Заштурхалі туды столькі, колькі ўлезла. Стаялі плячом да пляча, сесці было немагчыма, пераступіць з нагі на нагу таксама».*

Па меры прыбыцця аўтазакаў людзей размяркоўвалі па іх. Адвозілі ў Жодзіна, у ЦІП і ІЧУ ў завулку Акрэсціна.

Удзень у РУУС прыехалі аўтазакі для асабовага складу з амапаўцамі. Пагрузка людзей у аўтазакі суправаджалася гвалтам і пагрозамі. Многія затрыманыя расказваюць, што ў аўтазак зайшоў сілавік, перавёў зброю ў баявы рэжым і сказаў, што пры любым руху будзе страляць на паражэнне і яго за гэта ніхто не пакарае.

Частку затрыманых у аўтазакі грузілі штабелямі, ствараючы пласты з людзей, тыя, хто знаходзіліся ўнізе, проста не маглі дыхаць. Іншую частку ставілі на калені. Прымушалі прабірацца па ляжачых, спяваць афіцыйны гімн Беларусі. Адзіны, каму дазволілі сесці на лаўку, быў пажылы мужчына гадоў 70-ці.

*«У аўтазаку ляжыць чалавек тварам уніз, пластом, рукі за галавой. На ім у такім жа становішчы ляжыць яшчэ адзін, дакладна так жа, проста на ім. На ім трэці. Чацвёрты, пяты. І вось так вось чалавек дзесяць. Як бліны, ляжаць адзін на адным. Я кладуся на людзей і пасля гэтага на мяне яшчэ чалавек пяць».*

*«Нас ... пачалі класці адзін на аднаго штабялямі. Але ўнізе пачалі крычаць: “Зламаеце пазваночнік, я памру”. Яны нас пасадзілі на кукішкі».*

*«І чувак кажа: “Не, я ўскрыю вены, я скончу жыццё самагубствам, але я не сяду назад да іх у аўтазак”».*

## 16:00 • 20:00

***«...“Што вам у гэтай краіне не падабаецца? Прэзідэнт вас корміць...” [казалі сілавікі] Ну, разумееце, кожнае слова прыносіла некалькі ўдараў дубінкі, ці кулака, ці з нагі».***

***Паводле сведчанняў пацярпелага***

З 17 вечара ў РУУС пачалі прывозіць новых затрыманых. Аўтазакі спыняліся проста перад галоўным уваходам у будынак. Іх сустракаў шэраг з сілавікоў, якія збівалі людзей рукамі, нагамі, дубінкамі. Далей іх падымалі па лесвіцы на чацвёрты паверх, дзе знаходзілася актавая зала. На лесвіцы іх збівалі амапаўцы. У актавай залі, для большага прыніжэння, людзей прымушалі паўзці да трыбуны, дзе сядзелі сілавікі РУУС. Падлога была ўся ў плямах крыві. Людзей кідалі тварам уніз, прымушаючы трымаць рукі за спінай.

*«Далей давялі яны да лесвіцы ў гэтым РУУС. Там я ўжо практычна стаяць не мог, прымусілі паўзці. Пры тым, што рукі трымаць трэба ззаду... То бок, я на каленях, як мог...».*

*«Бачыў, як наперадзе людзі падалі, іх таксама білі... І на пачатку яшчэ калідора прымусілі паўзці да трыбунаў, гэта ў іх ці зала нарадаў, нешта такое. Вось такое памяшканне, дзе з аднаго боку, як у кіназале, крэслы, крэслы, не ведаю, і з іншага гэтыя трыбуны... І крык, плач, усё разам. Мяне паклалі і "Паўзі!"».*

*«Практычна ўсю дарогу гэта суправаджалася нейкімі абразамі, нейкімі спантаннымі ўдарамі. Дапусцім, калі мы праходзілі міма нейкага супрацоўніка, ён мог проста ўдарыць абсалютна выпадкова ў любую частку цела, куды ён трапіць».*

*«Агулам, мне загадалі легчы, рукі завесці за спіну і адштурхоўвацца аднымі нагамі, паўзці ў бок людзей, якія ўжо ляжалі там. Я, натуральна, не стаў гэтаму супраціўляцца, папоўз, як атрымлівалася. Дапоўз уперад па слядах крыві».*

Людзей, якія ляжалі на падлозе ў актавай зале, працягвалі збіваць. Па іх тапталіся берцамі, пастаянна наносілі ўдары, абражалі. Некаторых пазначалі — балончыкамі з фарбай малявалі на спінах крыжы.

*«Адзін раз супрацоўніку, відаць, зусім не было дзе ісці, ён прайшоўся ў мяне цалкам па спіне, дзвюма нагамі наступаючы, як па падлозе».*

*«Дапусцім, проста ідзе і ўдарае нагой па галаве ці па іншых частках цела. Я нават зараз не магу вам перадаць неяк паслядоўнасць усю гэтых удараў, іх было шмат, яны былі пастаянныя».*

*«Іншы супрацоўнік ззаду падбег з балончыкам фарбы і мне ад верхавіны да паясніцы намаляваў адну лінію і перакрэсліў яе іншай, то бок намаляваў такі своеасаблівы крыж».*

Асаблівая агрэсія была накіраваная на людзей, якія маюць дачыненне да сілавых структураў. Таксама моцна збівалі матацыклістаў.

Па іроніі лёсу ў залі знаходзіліся затрыманыя, якія падтрымлівалі рэжым Лукашэнкі. Яны ўвогуле не разумелі, што адбываецца, і спрабавалі даказаць сваю правасць, за што іх таксама збівалі.

> *«Ябацькам добра даставалася, бо яны не слухалі, што трэба ляжаць. Ім даставалася яшчэ больш, бо яны, ну, яны спрабавалі нешта даказаць. Хаця было ясна, што даказваць кожнае слова, кожны твой рух — гэта лішні ўдар».*

## 20:00 • 24:00

> ***«І проста… сцякала кроў па футболцы, і на джынсы, і красоўкі. Я вось так вось сядзеў, увесь гэты час капала кроў, потым яна высахла і перастала ісці».***
>
> ***Паводле сведчанняў пацярпелага***

Дастаўка затрыманых у РУУС працягвалася. Пасля выгрузкі з аўтазакаў і мікрааўтобусаў іх кідалі на асфальт і там збівалі. Потым іх падымалі і праганялі праз «калідор смерці» да актавай залы.

У актавай зале людзі ляжалі на падлозе, ім забаранялі рухацца і падымаць галаву. Для дагляду іх выводзілі ў суседні калідор, дзе таксама збівалі, прымушалі распранацца дагала. У тых, хто ляжаў, супрацоўнікі РУУС пастаянна патрабавалі асабістыя дадзеныя (ПІБ, адрас), а таксама дабіваліся, хто і колькі ім заплаціў.

Большасць з тых, хто знаходзіўся ў актавай зале, не прымалі ўдзел у акцыях пратэсту, іх забіралі ля пад'ездаў іх дамоў, па дарозе з працы, выцягвалі з таксі.

Сярод супрацоўнікаў РУУС было як мінімум тры жанчыны, збіццё затрыманых адбывалася на іх вачах і з іх маўклівай ухвалы.

> *«Я ўжо дыхаць нават не мог, таму што мяне ўжо валаклі і аб вушак білі падчас руху, крычалі: “Што ты за мужык, не можаш удараў трываць”, і гэтак далей. Я ім крычаў, што ў мяне адзін сын: “Не біце, мне трэба яго яшчэ выхоўваць”. Таму што такое адчуванне было, што яны гатовыя забіць проста».*

> *«Шпурнулі на падлогу гэтую крывавую, рукі за спінай, сказалі: “Паўзі ўперад”. Я поўз, наколькі мог так, без рук. Перыядычна зверху білі тыя, хто стаяў па баках, дубінкамі».*

*«Там таксама мяне білі пад ягадзіцу ў кропцы выхаду сядалішчнага нерва – нагамі туды білі. Потым пад паху білі нагамі. Потым, калі я ўжо амаль упаў, мяне яшчэ стукнулі рабром далоні ў аснову чэрапа, і я ўпаў на падлогу».*

*«Ты ідзеш, спрабуеш неяк не наступаць на людзей, падымаеш галаву – табе зноў прылятае. У выніку яны табе кажуць, што ў мяне пад нагамі чыясьці рука і бяруць і кідаюць мяне, а на падлозе чыясьці кроў, лайно. Відаць, нехта сходзіў пад сябе. І я падаю і добра, што ў мяне была маска, звычайная, тканінная».*

*«"Підарасы, мы вас пазабіваем! Што вам, бля, жывецца дрэнна? Хіба ў вас заробкі маленькія? Вы хочаце, каб быў бунт, як ва Украіне, каб было ўсё дэстабілізавана?". І гэта быў не дыялог, а проста іх маналог».*

Асабліва збівалі людзей з нацыянальнымі атрыбутамі (вышыванкі, значкі, бранзалеты), у камуфляжным адзенні. Тых, каго пазначалі балончыкам жоўтай фарбай (пазначыць маглі за што заўгодна, у тым ліку за вышыванку) — мацней і даўжэй. У актавай зале таксама знаходзіліся непаўнагадовыя, жанчыны.

*«Кінулі на падлогу на трэцім паверсе, разбілі падбародак, прымусілі паўзці. Я поўз па плітцы да нейкай актавай залы... Мяне яшчэ фарбай жоўтай аблілі. І тых, каго аблілі фарбай, яны якраз больш жорстка збівалі...».*

*«Але калі сядзела і глядзела ўніз, я сядзела з краю гэтых крэслаў актавай залы, а пасярэдзіне быў калідор, у які складалі людзей, каб яны клаліся ўніз, і іх прымушалі паўзці. І калі яны паўзлі, іх білі рукамі і нагамі. Я бачыла людзей, якія паўзлі і пасля іх заставаўся след крыві, было страшна. Людзей білі проста ў гэтай актавай зале».*

*«Па некаторых рэчах — як берцы, штаны вайсковыя камуфляжныя, майка белая, з Пагоняй, белыя стужкі (казалі: "Ты за Ціханоўскую? Яна табе дасць") — ім даставалася значна больш».*

Бліжэй да апоўначы людзям у актавай зале загадалі сесці на крэслы, пакласці рукі на сядзенні спераду далонямі ўгару і апусціць галаву паміж рук уніз. У такой позе яны знаходзіліся да абеду наступнага дня. Некаторыя засталіся ляжаць тварам у падлогу. На просьбы пра наданне медыцынскай дапамогі сілавікі адказвалі грубасцю і хамствам, дапамога ніко-

му нададзеная не была. Аднаго з затрыманых збілі да такой ступені, што з залі яго выносілі на насілках. За просьбу наведаць прыбіральню некаторых збівалі, таму прасіць пра гэта баяліся.

> *«Рукі заламаўшы, пасадзілі на крэсла ў актавай зале, у позу, калі сядзіш на крэсле, галава ледзьве не на каленях, сагнутая да каленяў, рукі над галавой выцягнутыя, ляжаць на спінцы перад сабой. Так сядзелі 10 гадзінаў у гэтай позе».*

> *«Папрасіў выклікаць хуткую, але людзі, якія там былі, гэтыя жанчыны, якія нас даглядалі, сказалі: "Якая хуткая? У нас тут людзі восем разоў прытомнасць страчваюць і ніякай ім хуткай"».*

> *«І быў жудасны момант, калі нас прывезлі, нехта вельмі гучна крычаў, вельмі гучна. Яго білі, ён пачынаў хрыпець, стагнаць і ў нейкі момант ён замоўк... Я гляджу краем вока, я ж не магу павярнуцца, і бачу, што ідуць берцы і нясуць насілкі. На насілках хтосьці ляжыць і зноў ідуць берцы ў абсалютнай цішыні».*

Затрыманых, якіх прымалі за каардынатараў пратэстаў, дапытвалі ў кабінетах на 4-м паверсе. Допыт вёўся з ужываннем катаванняў. Увесь час задавалі пытанні пра тое, колькі ім плацяць і хто іх наняў. Праводзілі агляд тэлефонаў.

> *«Зацягнулі на 4-ты паверх, ... (неразборліва) кабінет. Туды зайшлі адразу тры супрацоўнікі. ... Узялі тэлефон, пачалі дапытваць. Перыядычна збівалі дубінкай. ... У раёне гадзіны напэўна збівалі. У кабінеце дапытвалі, хто плаціць, як камунікуеце. Колькі плацяць. Калі катавалі, скажам так, білі-збівалі, пыталіся: "Чаму не любіш рускіх? Чаму не любіш рускіх?"».*

Вось як 11 жніўня ў Маскоўскім РУУС коратка апісаў адзін з затрыманых:

> *«То бок, іх там білі гэтымі дубінкамі. Відаць было ўдары, парванае адзенне, сляды крыві, крыкі, адпаведна. Гэтая карціна працягвалася. Такі быў парадак: прывезлі, на падлогу, дагляд, вяртаешся або на падлогу, або цябе садзяць за нейкае месца ў гэтай залі на крэсла. У крэсле ты сядзіш з сагнутай галавой, рукі наперад. Калі ты падымаеш рукі, галаву, то б'юць дубінкай, каб ты сядзеў толькі ў такой позе. Дапытвалі мяне: пыталіся, што я рабіў, колькі заплацілі».*

## 12 жніўня 2020 года

*«Усю ноч прывозілі людзей па гэтым калідоры. Гэта яны называлі “калідор смерці”. Калі прывозілі людзей, роў, стогны, крыкі, маленні даносяцца спачатку знізу, мы сядзім чуем гэта ўсё. Цягнуць потым усіх гэтых людзей наверх, кідаюць на падлогу ля ўваходу, “паўзі”, і зноў мат, перамат, “пачвара”, усе абразы, якія можна прыдумаць. “Паўзі на жываце”, кідаюць адзін на аднаго, “паўзі з гэтым” і збіваюць усіх вакол нагамі, палкамі гумовымі, пакуль людзі паўзуць».*

*Паводле сведчанняў пацярпелага*

Людзей, дастаўленых у Маскоўскі РУУС 12 жніўня, таксама праганялі праз “калідор смерці”. Праход па гэтым калідоры суправаджаўся збіццём і абразамі. Затрыманым у гэты дзень таксама рэдка давалі ваду, не кармілі і амаль не выводзілі ў прыбіральню.

Збіццё ў актавай зале і іншых памяшканнях было такой сілы, што людзі часам не вытрымлівалі і міжвольна спаражняліся пад сябе. Апытаныя неаднаразова ўказвалі на тое, што ўвесь калідор у РУУС быў у крыві, мачы і кале.

Сілавікі праяўлялі неверагодную жорсткасць і ў дачыненні да жанчын. Жанчыны паведамілі пра збіццё, знявагу і пагрозы згвалтаваннем. Сілавікі ў РУУС былі настолькі агрэсіўныя, што некаторыя жанчыны пачалі думаць, што іх там заб'юць. Яны гатовыя былі хлусіць, што нехта заплаціў ім за ўдзел у мітынгу — абы толькі не забілі.

Пацярпелыя таксама сведчаць пра тое, што ў РУУС у той дзень сярод затрыманых былі непаўнагадовыя дзеці, 15–17 гадоў.

Кіраўніцтва РУУС не рэагавала на тое, што адбывалася, не спрабавала нейкім чынам спыніць катаванні затрыманых. Увечары 12 жніўня адзін з сілавікоў падчас допыту здзейсніў акт сексуальнага гвалту ў дачыненні да дапытванага. Пра гэта Міжнароднаму камітэту па расследаванні катаванняў у Беларусі паведаміў сам пацярпелы. Згвалтаванне было здзейсненае супрацоўнікам РУУС у прамежку з 20:00 да 24:00.

00:00 • 04:00

***«І так усю ноч. Новыя прывозы, катаванні, кагосьці цягнулі, былі пагрозы: “Мы цябе заб'ем, і нам за гэта нічога не будзе!”. Яны не баяліся гэтага агучваць. Я потым зразумеў, што ім нічога за гэта не будзе і не было».***

***Паводле сведчанняў пацярпелага***

Уначы 12 жніўня дастаўка затрыманых у РУУС працягвалася. Людзей падымалі па “лесвіцы смерці”, дзе на кожным пралёце стаялі па 3-4 сілавікі і хаатычна наносілі ім удары дубінкамі, рукамі і нагамі. Працягвалі збіваць у актавай зале. Тых, хто ляжаў там на падлозе тварам уніз, неміласэрна збівалі нагамі і дубінкамі па ўсіх частках цела.

*“... перада мной бег хлопец. Яму, я не ведаю чым, хутчэй за ўсё ботам, прыляцела ў твар, і проста там убачыў, як некалькі зубоў проста вось вылецела ў яго з рота, і карацей зразумеў, што трэба хоць твар паспрабаваць захаваць...”*

*«Білі насамрэч... Хтосьці біў нагамі, хтосьці біў дубінкай — як патрапіць. Калі падымаешся на чацвёрты паверх, там справа, злева ляжалі тыя, каго затрымалі. Іх збівалі пры мне непасрэдна нагамі супрацоўнікі ў форме».*

*«Білі па ўсіх частках, і па галаве, ім усё адно — хто куды патрапіў. Ведаю, што некаторых сапраўды калечылі, мяркуючы па крыках, стогнах так рабілі з лекарам, маладым мужчынам, яго прывезлі ўначы, калі менавіта не памятаю. Яго білі з асаблівай стараннасцю, паколькі ён надаваў меддапамогу, і іх гэта злавала: “Ты надаваў дапамогу тым, хто спрабуе нам супрацьстаяць, хто ў нас спрабуе камянямі кідаць!”... Некаторых збівалі вельмі моцна, мяркуючы па крыках, маленнях і стогнах».*

Актавая зала стала асаблівым месцам катаванняў. Паводле паведамленняў пацярпелых, уначы там знаходзілася каля 50 чалавек. Людзі сведчылі пра тое, што, калі прыводзілі ў актавую залу, іх кідалі на падлогу тварам уніз да астатніх затрыманых. На падлозе былі сляды крыві і нават выбітыя зубы. Там людзей “фіксавалі”: пытаючыся імя, прозвішча, імя па бацьку і ўсе абставіны затрымання, у некаторых — пра памер іх заробку, таксама забіралі адзенне, папругі, змесціва кішэняў.

*«Адразу ж як мы заходзілі ў актавую залу, усіх кідалі тварам уніз. Хлопцам казалі паўзці да найбліжэйшага вольнага месца, дзяўчат потым падымалі і садзілі таксама тварам уніз на*

*крэсла. У нейкі момант, паколькі ты ідзеш "тварам уніз", ты бачыш кроў, пот, нечыя зубы».*

*«У актавай зале пачалі зноў правяраць, знялі байку, знялі шнуркі, папругу. Усё пазабіралі з кішэняў. Пакінулі ў майцы, у штанах. І красоўках».*

*«Былі людзі збітыя... Што рукі ў кагосьці сінія былі. Паўсюль усе па-рознаму сядзелі. І там яшчэ прывезлі двух мужчын. Аднаго з іх даволі доўга білі дубінкамі прама ў актавай зале. Ён увесь час агрызаўся. Нешта казаў у адказ. І яго лупілі».*

*«Яны зразумелі, што ад мяне нічога не могуць дабіцца і павялі ў агульную актавую залу, дзе на падлозе ляжалі людзі. Хтосьці біўся ў эпілепсіі, кагосьці без канца ванітавала, таму што ў яго страсенне мазгоў, ён казаў, што ў яго расколваецца галава, ён усё з сябе званітаваў і зараз ён ванітуе галаўным мозгам і яму прама цяпер трэба, каб яму выклікалі хуткую. Ніхто на гэта не рэагаваў, калі ён ледзь не памёр, яго забралі, смяяліся: "Ну ўстаць ты змог, што табе?"».*

Выбарачна некаторых затрыманых пазначалі фарбай з балончыкаў, малюючы крыжы ці робячы іншыя пазнакі, — гэтых людзей сілавікі збівалі з большай сілай. Няшчадна збівалі затрыманых з адметнымі прыкметамі ў выглядзе татуіровак або дрэдаў. Апроч іншага, супрацоўнікі зневажалі і абражалі грамадзянаў па прыкмеце іх колеру скуры.

*«І ў гэты момант прывялі таксама сябра майго. Таварыша, з якім я быў. Яго паставілі побач. І нас пафарбавалі з балончыкаў. І паклалі ў актавай зале тварам проста ў падлогу. Крыж з кругам намалявалі. На спіне. Штаны крыху зачапілі. І на майцы. А сябра майку і джынсы размалявалі».*

*«Да мяне падыходзілі, прыязджаў новы нарад кожны раз і пытаўся, што ў мяне за татуіроўкі. То бок білі за татуіроўкі па спіне дубінкай, па галаве рукой, яшчэ як-небудзь. І так усіх».*

*«Там хлопчык Глеб, цемнаскуры, вось ён побач са мной сядзеў... Яны як быццам ніколі не бачылі цемнаскурых людзей, яны ніколі не бачылі татуіроўкі. То бок, яны ставіліся так, як быццам яны ў заапарк прыйшлі паглядзець на людзей проста. Людзі проста нейкія абмежаваныя былі, я не ведаю. Са мной сядзела дзяўчынка, якая была ў ружовай байцы, можа, бачылі, з дрэдамі. Потым я проста прачытаў, што з ёй адбылося, што яе білі ўчатырох дубінкамі і што адрэзалі валасы, што выбівалі крэсла з-пад яе, то бок вось такі жах».*

> *«І так мы сядзелі, ну, гадзінаў дванаццаць. І між гэтым супрацоўнікі ўвесь час там, ну, гнабілі мяне, што я чарнаскуры. Ну, фарбаваны, я тады быў з ружовымі валасамі атрымліваецца, але з блакітнымі ўстаўкамі. І гэта доўжылася ўвесь час у прынцыпе».*

Частка людзей, якія ўтрымліваліся ў актавай зале, ляжалі тварам уніз на падлозе, іншыя былі вымушаныя нерухома сядзець на крэслах у вельмі нязручных позах, апусціўшы галаву і паклаўшы рукі на плечы чалавеку, які сядзеў наперадзе. Людзі правялі ў такім становішчы прыблізна 13–15 гадзінаў.

> *«Там ужо пасадзілі на сядзенне, то бок сказалі апусціць галаву ўніз і пакласці рукі вось так на плечы наступнаму чалавеку. І так сядзець, галаву не падымаць і не рухацца... І мы так сядзелі каля, не ведаю, 13 гадзінаў, 15, я не магу сказаць дакладна. Ну так, недзе да абеду, да 14 гадзінаў наступнага дня».*

> *«Ну, хто падымаў галаву, таго адразу папярэджвалі, потым білі. Гэта цяжка так сядзець столькі часу, проста рукі ацякаюць, шыя зацякае. І добра я, у мяне фізічная форма больш-менш дазваляе так сядзець, але там людзі сталага веку былі, людзі з не вельмі добрай фізічнай формай, то бок поўныя людзі. І ім вельмі цяжка было. Яны не маглі, варушыліся. Галаву падымалі, і іх білі за гэта».*

З асаблівай жорсткасцю ў актавай зале збівалі чалавека ў медыцынскім адзенні і з медыкаментамі ў торбе. Як паведамлялі пацярпелыя, ён быў лекарам. Затрыманаму, у якога знайшлі бензін у торбе, уліпі гэты бензін у рот у памяшканні, размешчаным за сцэнай актавай залы.

> *«Быў хлопец, ён быў лекарам, на ім была апранутая медыцынская форма... І яны білі яго з-за таго, што ў яго былі нейкія прэпараты ў торбе. Ён кажа: "У мяне была ўчора змена, а сёння, улічваючы тое, што адбываецца, я хацеў дапамагчы людзям". Але яны яго білі і абзывалі за прэпараты ў торбе, якія, як яны хацелі падаць, мелі нейкую баявую каштоўнасць».*

> *«Наколькі я разумею, яго ім напаілі, ну то бок, ну вось гэтым вось бензінам, які ў яго знайшлі, то бок яму прама вось бутэльку ў рот усунулі».*

Становішча затрыманых у тую ноч ускладнялася тым, што сілавікі ў большасці сваёй не давалі магчымасці скарыстацца прыбіральняй, з-за чаго людзі былі вымушаныя спраўляць патрэбу пад сябе. Паводле сведчан-

няў затрыманых, з трох просьбаў схадзіць у прыбіральню ці даць вады, на дзве ішлі дадатковыя ўдары, а ў трэці раз маглі і пашкадаваць, адвесці ў прыбіральню.

> *«Выйсці ў прыбіральню, ну, выпускалі рэдка. Там людзі сікалі пад сябе. Ну, хадзілі па вялікім таксама пад сябе, некаторыя, ад болю, яшчэ нечага...».*

> *«...там быў такі алгарытм, звычайна ты просіш першы раз, табе там прылятае, умоўна кажучы, ну тыпу там, не ведаю, удар куды-небудзь, так. Просіш другі раз — таксама прылятае, але на трэці раз ужо хутчэй за ўсё цябе там выведуць у прыбіральню, або дадуць табе вады, вось такі прыкладна быў алгарытм».*

Сярод затрыманых у РУУС у тую ноч былі дзяўчаты і непаўнагадовыя хлопцы ва ўзросце ад 15 да 17 гадоў. Іх таксама збівалі.

> *«Самае жорсткае было, калі хлопца, 17–18 гадоў, прыносяць, даглядаюць, здымаюць трусы, паўсюль залазяць... І сядзяць дзве жанчыны, і яны спакойна ўсё запісваюць. То бок, у іх на вачах забіваюць хлопцаў, а яны проста спакойна пішуць».*

> *«Было некалькі дзяцей, хлопцаў і дзяўчат. Калі мяне паклалі на падлогу, побач паклалі дзіця, хлопца. Пачалі яго апытваць, колькі гадоў. Ён сказаў 15 гадоў. Яны накінуліся на мяне, чаго ты прыцягнуў дзіця з сабой, чаму ты яго навучыш? І дубінкамі зверху. Гэты хлопец сказаў, што "дзядзьку я не ведаю і я не з ім"... Потым таксама прыводзілі дзяцей, іх апытвалі, ім было 15 гадоў, цягалі іх у такой самай позе, як і ўсіх. Гэта было да моманту апытання. Што з імі было потым, не магу сказаць».*

Дзяўчат пры допытах катавалі, прымушаючы прызнацца ва ўдзеле ў пратэстах за аплату.

> *«Мяне пасадзілі ў цэнтры на крэсла, пачалі задаваць пытанні, колькі і хто мне заплаціў. Я па-ранейшаму не ведала, што адказаць на гэта, пасля чаго яны сказалі: "Нармальна, ты не можаш, окей!". Выбілі з-пад мяне крэсла, прымусілі сесці на зямлю і за кожны няправільны адказ на іх погляд, білі дубінкай па два ўдары. Шэсць удараў па ягадзіцах зарабіла, плакала... Растлумачце, што гэта ўвогуле значыць? І дадатковыя ўдары па нагах».*

Пагрозы сексуальнага гвалту гучалі ўвесь час, як мужчынам, так і жанчынам.

*«Дзяўчаты таксама былі ў актавай залі. Адна з іх гутарыла з адным амапаўцам. З іх здзекаваліся: пагражалі згвалтаваннем, "у камеру да зэкаў", і самі яны — псіхалагічнае ўздзеянне».*

## 04:00 • 08:00

***«Я сядзеў на другім шэразе. Перада мной быў хлопец, перавязаны ўласнай майкай, галава разбітая, кроў ззаду запечаная. На спіне кроў, майка падраная і ён ёй перавязаны».***

***Паводле сведчанняў пацярпелага***

Пазней уначы людзей пачалі разводзіць у камеры РУУС. З аднаго памяшкання ў іншае пераводзілі ў позах, якія прычыняюць боль. Пацярпелыя паведамлялі, што шлях у камеру (ці як гэта называлі затрыманыя — карцар), а таксама ў актавую залу і часам у прыбіральню быў у суправаджэнні двух сілавікоў, якія скручвалі кожнага "ў ластаўку".

*«Падышлі 2 супрацоўнікі, скруцілі ў ластаўку і павялі кудысьці па лесвіцы ўніз. Як аказалася, яны вывелі мяне ў карцар, там ён быў ужо напоўнены людзьмі».*

*«Далей цябе "тварам уніз, рукі за спіну" даводзяць да актавай залы».*

*«Адзін раз я таксама папрасіўся ў прыбіральню. Галавой дзверы ў прыбіральню адчыніў, у гэтай жа позе, сагнуўшыся ў падлогу, да прыбіральні, галавой у дзверы. Я дзверы зачыніў за сабой. Адчыняе дзверы і дубінкай па мне, але трапіў больш па вушаку, за тое, што я дзверы зачыніў. Хаця я нават не ведаў. Схадзіў, зноў нахілілі, на гэтае месца».*

У камерах было душна, бо яны былі неверагодна перапоўненыя. Пацярпелыя паведамлялі, што камера ўяўляла з сябе цалкам закрытае бетоннае памяшканне плошчай 2 на 4 метры. Вялікую частку часу вентыляцыя была адключаная, і таму катастрафічна не хапала паветра. Усе былі мокрыя, потныя і паведамлялі пра тое, што дыхаць было немагчыма. На патрабаванні да сілавікоў уключыць вентыляцыю яе ў рэдкіх выпадках ненадоўга ўключалі, потым зноў спецыяльна выключалі. Было настолькі горача, што на сценах камеры збіраўся кандэнсат.

*«Вентыляцыя была адключаная, і знаходжанне ў гэтым карцары, па вялікім рахунку, было адным з самых жудасных дос-*

*ведаў наогул за ўвесь час майго затрымання. Таму што там было неверагодна горача, пот цёк проста ракой, яго выціраеш, і ён зноў назапашваецца».*

*«Увогуле, там было вельмі-вельмі горача. Было вельмі цяжка дыхаць, і, каб хоць неяк астуджацца, мы спрабавалі як мага большай плошчай цела дакранацца да бетонных сценаў. Яны хаця б крышачку давалі адчуванне холаду, хаця б мінімальна».*

Камеры былі перапоўненыя. Паводле словаў пацярпелых, у адзіночных і двухмясцовых камерах знаходзілася адначасова да 30 чалавек. Людзей не кармілі, амаль не давалі ваду, вадзіць у прыбіральню адмаўляліся.

*«Нас пачалі ў адзіночныя камеры адводзіць і нас ставяць адзін да аднаго спінай. Нас было ў адзіночнай камеры 30 чалавек. Нас усіх забілі ў камеры, прычым гэтыя камеры так зробленыя, там ёсць вентыляцыйныя шахты, вентылятары самі там нечым замазаныя, што 30 чалавек у камеры — дыхаць няма чым».*

*«Нас упіхнулі ў камеру 13 чалавек. Туды максімум можа легчы ў нармальным становішчы тры чалавекі. Там было неверагодна душна, горача. Там ні дыхаць, нічога, там намагаліся проста сядзець і нічога не рабіць, таму што ўсё цалкам зачынена. Увесь час гарэла святло».*

*«Я магу даслоўна [дыялог прывесці]. Стукаем — “Трэба было дома хадзіць у прыбіральню”, стукаем — “Трэба было дома піць ваду”. Гэта даслоўна».*

Акрамя стварэння бесчалавечных умоваў, сілавікі звярталіся і да іншых спосабаў прыніжэння людзей, якія ўтрымліваюцца ў камеры. Так, яны вялі відэаназіранне за затрыманымі і патрабавалі знаходзіцца ў камеры толькі з рукамі за спінай і нахіліўшы галаву ў падлогу.

*«Стаяць у камеры дазвалялася толькі тварам у сцяну з закінутымі за спіну рукамі. Усё гэта адсочвалася вельмі моцна, бо ў карцары, калі не памыляюся, вісела дзве камеры і, відаць, супрацоўнік перыядычна глядзеў у іх, каб мы не мянялі сваё становішча, каб мы не апускалі рукі, каб ніхто не сядаў».*

Каб затрыманыя выконвалі патрабаванні, сілавікі звярталіся да пагрозаў распыліць газ у і без гэтага душную камеру. Гэтыя пагрозы былі ўспрынятыя затрыманымі рэальна. У той час як адны расказвалі, што ў іх камеру толькі пагражалі распыліць газ, іншыя сведчылі пра непасрэднае распы-

ленне слезацечнага газу ў перапоўненую камеру. Паводле словаў пацярпелых, дзяжурны РУУС таксама пагражаў засыпаць у камеру хлорку.

> *«… І ў нейкі момант ён пастукаў і сказаў, звяртаючыся там да аднаго з хлопцаў, што калі ён яшчэ раз апусціць рукі, то ў камеру пусцяць газ. На той момант я не разумеў, пра які газ ідзе гаворка, потым зразумеў, таму што ў суседнюю камеру, відаць, ім паступалі такія ж пагрозы ўжывання газу. Як аказалася пасля, адчынілася вакенца назіральнае, ці нейкім іншым чынам, можа, адчыніліся дзверы, і ім туды распылілі пярцовы газ са звычайнага балончыка. І людзі кашлялі вельмі моцна, яны кашлялі доўга. У гэты момант часу ў нашай камеры, вядома ж, стаяла поўная цішыня, бо ўсе былі ў поўным шоку».*

> *«Тут праходзіць нейкі час, ён адчыняе дзверы, паварочваецца да нас і кажа: "Я вас папярэджваў". І пырскае газам, проста на майку. Усім становіцца дрэнна. Я кажу хлопцам, каб мы не рухаліся. Каму дрэнна — кладзіцеся туды ўніз, таму што газ будзе падымацца і (будзе лягчэй) і не трыце твар. Мы нейкі час стаім у газе. Гэта самае горшае, што было ў гэтым усім. Увесь гэты боль — не так страшна, а вось гэта было страшна. … Гэта быў самы нізкі ўчынак. Я лічу, што гэта недапушчальна. Ну, гэта проста самае нізкае, што можна зрабіць. У замкнёнай прасторы, напшыкаць з балончыка, і пры гэтым ён атрымліваў нейкае задавальненне ці што».*

> *«Дзяжурны кажа, што мы павінны выконваць ягоныя патрабаванні: "Вас дзевяць чалавек, вы павінны толькі ўчатырох сядзець, а пяць стаяць, і вы павінны мяняцца, а калі не, то вам хана, я вам засыплю хлоркі". Гэта даслоўна. Я пахадзіў паглядзеў гэтую камеру, там сапраўды нейкія белыя плямы былі. … Доўга мы там знаходзіліся. 10 гадзінаў».*

Таксама сілавікі здзекаваліся з затрыманых з дапамогай так званага "ўціхамірвальнага крэсла" ці "стакана", на якім людзі заставаліся сядзець у вымушанай позе да 4–5 гадзінаў раніцы.

> *«І кажуць: "Ты што, занадта разумны?" на мяне. І там ёсць такое ўціхамірвальнае крэсла, яно прыкручанае да падлогі. То бок яно не рухаецца ні налева, ні направа. Яны мяне… прывязалі, не прывязалі, а прышпілілі кайданкамі. Я гэтага, хто мяне прышпільваў, па сутнасці добра запомніў. Ну і сядзеў мусіць так гадзінаў можа да 4–5 раніцы».*

*«Другога мужыка, якога збівалі на падлозе, яго пасадзілі менавіта ў стакан так званы, дзе табурэтка прыкручаная да падлогі. Яму на ўсю ноч прыкулі ногі да табурэткі. І рукі да табурэткі. І ён усю ноч сядзеў на гэтай табурэтцы. Усю ноч ён крычаў, каб яму кайданкі аслабілі».*

У РУУС пацярпелым не надавалася медыцынская дапамога, просьбы пра дапамогу ігнараваліся. Людзі з цяжкімі траўмамі праводзілі ноч з неверагодным болем.

*«... ужо заводзілі многіх у камеры, па два чалавекі там, дзе можна было паспаць. Вось да іх у камеру закінулі чалавека, ён ледзь дыхаў, яму не выклікалі хуткую. Толькі калі памянялася змена, новы амапавец выклікаў хуткую, і аказалася, што ў яго пераламаны пазваночнік».*

Тыя з затрыманых, хто застаўся ў актавай зале, паведамлялі, што бліжэй да раніцы іх перавялі да сцэны і распачалі працэс афармлення і падпісання пратаколаў. Таксама ў памяшканні, размешчаным за сцэнай актавай залы, адбывалася відэаздымка, падчас якой затрыманыя паведамлялі свае дадзеныя: імя, прозвішча, месца затрымання, дату нараджэння.

*«Мне даюць нейкія паперы, я выпростваюся і ўсё ... Падсоўваюць нешта, нічога прачытаць не магу. Яны сказалі: "Ідзі, так трое сутак так будзеш сядзець далей, мы цябе маем права трое сутак трымаць, і паедзеш па іншым артыкуле". Памятаю толькі, што было пра "ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу па адрасе праспект Дзяржынскага 115" і далей усё паплыло. Паперка гэтая была, паводле іх словаў, пра тое, што я папярэджаны пра крымінальную адказнасць, што яна наступіць другі раз. Яшчэ нейкую паперку падсунулі. Яшчэ нешта была пад подпісамі адмова, было напісана ў дужках адмова, сцяміць не мог за што... У сваім стане я нічога не мог прачытаць, а яны прымушалі падпісаць. Ці не падпісваеш і сядзіш трое сутак, а я ўжо ног і цела не адчуваю ад гэтай позы».*

Тыя, каго адводзілі з актавай залі для дагляду ці допыту ў іншае памяшканне, паведамлялі, што да іх ужываўся гвалт. Пацярпелая дзяўчына расказала, што яе хапалі і ўтрымлівалі за валасы, адзін раз далі аплявуху.

*«Недзе а 7:30 раніцы мяне вывелі на дагляд і завялі ў маленькі пакойчык. Там былі дзве такія жанчыны, якія як бы павінны былі даглядаць. На мяне з ходу пачалі крычаць, што праз мяне яны працуюць падвоеную колькасць часу. То бок, яна павінна была даўно быць дома, але тут з'явілася я. На што я адказала, нешта рэзкае, за што атрымала па твары. Мяне паставілі*

*тварам да сцяны, пачалі распранаць, каб даглядзець. У нейкі момант праходзілі супрацоўнікі ці АМАПа ці якія ў РУУС працуюць — хлопцы ў форме — убачылі, што яна трымае мяне за валасы. Нейкі малады хлопец сказаў: “Не трэба, ёй жа ўвогуле гадоў 15” (я досыць молада выглядаю). На што яна сказала: “Не твая справа, мы самі разбярэмся”. І яны проста сышлі. Яна дала мне аплявуху, схапіла за валасы і сказала, што калі я яшчэ раз скажу нешта рэзкае, я даведаюся, што такое боль».*

Яшчэ адна затрыманая расказала, што яе цалкам распранулі на даглядзе ў прысутнасці трох сілавікоў.

*«Пасля чаго мяне выклікалі на дагляд. ...Мы зайшлі з гэтай паненкай у кабінет, дзе сядзела за сталом тры мянты. Яна сказала “выходзім”, а яны “а не, мы адвернемся”. Спрачацца ў мяне ўжо сілаў не было, а на даглядзе трэба распранунца цалкам. Зняць трэба было ўсё адзенне цалкам. На той момант мяне гэта не вельмі кранала, але цяпер я абураюся. Чаму там сядзела тры мужыкі?».*

## 08:00 • 12:00

***«Потым мяне вярнулі назад у актавую залу. Мы там ноч сядзелі ў пэўнай позе, нельга было спаць. Мужчын білі, калі яны засыналі, стагналі ці крычалі».***

***Паводле сведчанняў пацярпелай***

Зранку 12 жніўня затрыманых пачалі перагружаць з камераў у аўтазакі і адвозіць у ЦІП у завулку Акрэсціна. Перавод з камераў у аўтазакі суправаджаўся крыкамі і збіццём. Людзей літаральна кідалі ў аўтазак тварам у падлогу адно на аднаго. Пасля ў аўтазаку сілавікі загадалі ім сядзець на кукішках з рукамі за спінай. За невыкананне гэтага патрабавання збівалі дубінкамі.

*«Праходзіць дзве гадзіны, я чую, што суседнія дзверы пачынаюць адчыняцца, і чую, што ўдары і крыкі, пачынаюць кагосьці біць, і ў нашай камеры адчыняюцца дзверы. Нам заламваюць рукі амапаўцы, але потым яны прызналіся, што гэта САХР. Нас усіх проста закідваюць у аўтазакі, тварам у падлогу, нічога не тлумачаць...».*

## 12:00 • 16:00

***«Хтосьці пачаў плакаць, хтосьці прасіў хаця б устаць на калені, а не проста на падлозе ляжаць... На што ўсе казалі: “Заткніцеся!”, “Не вашая справа!”».***

***Паводле сведчанняў пацярпелага***

Бліжэй да 14:00 частку затрыманых вывелі для транспартавання, аднак аўтазакаў не хапіла і людзей не было куды размясціць. Сілавікі пачалі здзекавацца з іх, ставячы на калені на бетонную падлогу галавой уніз. Ім давялося стаяць у такіх позах каля гадзіны, што прычыняла невыносны боль. Пацярпелыя расказвалі, што некаторыя пачыналі плакаць і стагнаць, бо многія правялі без руху ўсю ноч.

*«...Нас усіх паставілі каленямі на бетонную падлогу, галаву ў падлогу, і сказалі чакаць. Так мы стаялі каля гадзіны... З намі былі і хлопцы, і дзяўчаты... Многім праз 20–30 хвілінаў стала вельмі дрэнна, бо ты ўсю ноч прасядзеў без руху, а потым цябе ставяць на бетон. У нейкі момант дазволілі стаць тварам да сцяны, таму што ўсе ўжо знемагалі ад болю і знямогі».*

## 16:00 • 20:00

***«У канчатковым выніку я зламаўся, скажам так, пасля пагрозаў. Яны пагражалі і галавой ва ўнітаз акунуць і згвалтаваць — шмат словаў і справы ў выглядзе збіцця».***

***Паводле сведчанняў пацярпелага***

У РУУС працягвалі дастаўляць затрыманых. Пацярпелыя паведамлялі пра бесперапынны гвалт, здзекі, абразы і пагрозы згвалтавання. Пры гэтым адзначалі, што сілавікі разумелі супрацьпраўнасць сваіх дзеянняў і ў перапынках паміж здзекамі папярэджвалі адзін аднаго пра тое, што крыкі людзей, якіх яны збіваюць, могуць пачуць у суседніх кабінетах РУУС.

*«Мяне даставілі туды, і адвялі на другі паверх, дзе адразу, без размоваў, пачалі збіваць. Я прасіў іх спыніцца, крычаў. На другім паверсе мяне збівалі, можа, хвілінаў 15–20, пасля чаго зайшоў нейкі чалавек і сказаў: “Цішэй, тут грамадзянскія ў суседнім кабінеце”. Пасля чаго яны перарваліся недзе хвілінаў на пяць».*

Каб працягнуць збіваць пацярпелага без асцярогі, што іх могуць пачуць іншыя, сілавікі вырашылі змяніць лакацыю і перавялі затрыманага на 4-ты

паверх. Там працягвалі катаванні яшчэ цягам гадзіны.

> *«І праз пяць хвілінаў мне заднюю частку маёй байкі нацягнулі на галаву, на вочы, каб я нічога не бачыў, узялі пад рукі і пацягнулі наверх, на чацвёрты паверх. Па дарозе яны казалі, што “Зараз мы падымемся на чацвёрты, там няма нікога, і там цябе ніхто не пачуе”. Па адчуваннях крыху больш за гадзіну працягвалася збіццё».*

